# Выбары*2025. Папярэдняя аналітычная справаздача паводле вынікаў назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*[1]2025 арганізаваная Беларускім Хельсінкскім Камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае і аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі паводле адкрытых крыніцаў і паведамленняў ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ЗМЕСТ


ВЫСНОВЫ ........ 2
**1. СІТУАЦЫЯ НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ ........ 10**
**2. НАЗІРАННЕ ЗА ВЫБАРАМІ* ........ 12**
2.1. Умовы назірання ........ 12
2.2. Дзейнасць акрэдытаваных назіральнікаў ........ 13
**3. ПРАВАВАЯ БАЗА ........ 16**
**4. ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ ........ 20**
**5. ВЫЛУЧЭННЕ І РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ ........ 22**
**6. АГІТАЦЫЯ ........ 25**
**7. ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ ........ 36**
**8. ГАЛАСАВАННЕ Ў ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ (УКЛЮЧАЮЧЫ ГАЛАСАВАННЕ ПА МЕСЦЫ ЗНАХОДЖАННЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ) І ПАДЛІК ГАЛАСОЎ ........ 38**
Яўка ........ 38
Вынікі галасавання ........ 40
Абвяшчэнне вынікаў галасавання ........ 43
**9. СКАРГІ І ЗВАРОТЫ ........ 44**


[1] "Выбары*" у дачыненні да выбарчай кампаніі-2025 выкарыстоўваецца кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі напоўніцу рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае.

**ВЫСНОВЫ**

Чарговыя, сёмыя, прэзідэнцкія выбары* у Беларусі адбыліся на фоне глыбокага крызісу правоў чалавека, выкліканага рэпрэсіямі, што пачаліся пасля мірных пратэстаў супраць фальсіфікацый на папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах. Улады працягваюць адвольна пераследаваць паводле палітычных падставаў кандыдатаў,[2] сябраў выбарчых штабоў ды ініцыятыўных груп, назіральнікаў, актывістаў і проста неабыякавых грамадзян, якія паставілі свой подпіс за вылучэнне незалежных прэтэндэнтаў у кандыдаты на папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах 2020 г. Прызначэнне выбараў на 26 студзеня 2025 г., за 6 месяцаў да чаканай даты іх правядзення (і за 7 дзён да крайняга тэрміну рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты), сведчыць аб інструменталізацыі электаральных працэдур і маніпуляцыі заканадаўствам. Па сутнасці, улады падагналі дату выбараў пад палітычныя задачы, тым самым парушыўшы выбарчае заканадаўства з пункту гледжання роўнасці магчымасцяў кандыдатаў і прынцыпу прадказальнасці выбараў, прадугледжанага міжнароднымі стандартамі ў галіне выбараў.

**Праведзены кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" маніторынг усіх этапаў выбарчай кампаніі дазваляе зрабіць выснову, што выбары прэзідэнта не адпавядалі міжнародным стандартам правядзення дэмакратычных і свабодных выбараў, а таксама суправаджаліся шматлікімі парушэннямі Выбарчага заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Усе этапы выбарчага працэсу не проста кантраляваліся ўладамі адміністрацыйна, а былі імі арганізаваныя для ўтрымання Аляксандрам Лукашэнкам улады пры імітацыі яго шырокай народнай падтрымкі. Пра гэта сведчаць:**

- **поўны ўціск права на свабоднае выказванне меркаванняў, свабоду мірных сходаў, свабоду асацыяцый ды іншых правоў чалавека, без [належнай рэалізацыі] якіх немагчыма казаць пра свабодныя і дэмакратычныя выбары;**
- **непразрыстае фармаванне выбарчых камісій;**
- **узгодненыя ўладамі кандыдаты, якія пабудавалі свае перадвыбарныя праграмы не на крытыцы палітыкі А. Лукашэнкі, а на яго поўнай падтрымцы (за выключэннем Г. Канапацкай);**
- **збор подпісаў, накіраваны на стварэнне бачнасці падтрымкі толькі А. Лукашэнкі (заяўлены збор подпісаў больш за траціну ўсіх выбаршчыкаў), пры выкарыстанні адміністрацыйнага рэсурсу і прымусу, бо спісы адкрытыя і адмова ад подпісу магла стаць падставай для палітычнага пераследу;**

[2] "Кандыдат" ды іншыя назоўнікі марфалагічнага мужчынскага роду выкарыстоўваюцца ў значэнні агульнага роду і абазначаюць усе гендары.

- **агітацыя, пры якой усе кандыдаты акрамя А. Лукашэнкі былі практычна нябачныя ў інфармацыйнай прасторы, а ў падтрымку А. Лукашэнкі быў задзейнічаны адміністрацыйны і прапагандысцкі рэсурс для імітацыі палітычнай актыўнасці і шырокай падтрымкі, што практычна можна назваць абслугоўваннем культу А. Лукашэнкі;**
- **працяг практыкі прымусу выбаршчыкаў да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні;**
- **атмасфера запалохвання з забаронамі на фатаграфаванне і вынас бюлетэняў, дзяжурствам некалькіх супрацоўнікаў міліцыі на ўсіх участках для галасавання;**
- **непразрыстая працэдура падліку галасоў;**
- **заяўленыя рэкордныя лічбы яўкі (85,7%), у тым ліку на датэрміновым галасаванні (41,81%), якія перавышаюць дадзеныя 2020 г. (84,38% і 41,70% адпаведна), калі ўзровень палітызацыі і мабілізацыі грамадства быў значна вышэйшы, што было відавочна па чэргах на выбарчыя ўчасткі ў дзень галасавання;**
- **поўная адсутнасць незалежных назіральнікаў.**

Правядзенне свабоднай і адкрытай выбарчай кампаніі немагчымае ў сітуацыі палітычнага тэрору: спіс палітычных зняволеных штотыдзень папаўняецца і ў ім стабільна больш за 1200 чалавек. Інфармацыйная прастора цалкам зачышчаная; практычна ўсе незалежныя СМІ выціснутыя з краіны, а распаўсюд іх матэрыялаў з-за мяжы значна ўскладнены палітычна матываваным злоўжываннем антыэкстрэмісцкім заканадаўствам. "Дзяржаўная ідэалогія" абслугоўвае культ аўтарытарнага праўлення А. Лукашэнкі. У публічным полі няма прызнання важнасці палітычнага плюралізму. Фактычна ліквідаваныя ўсе апазіцыйныя палітычныя партыі ды палітычныя грамадскія арганізацыі, а іх лідары ды многія актывісты асуджаныя да пазбаўлення волі або былі вымушаныя пакінуць Беларусь праз пагрозы адвольнага, палітычна матываванага пераследу. Рэпрэсіўны ціск на арганізацыі грамадзянскай супольнасці, асабліва на праваабарончыя арганізацыі, ды іх масавая ліквідацыя, выключаюць грамадзянскі кантроль за правядзеннем выбараў. Незалежнае грамадзянскае назіранне за выбарамі ўнутры краіны адсутнічае; з міжнародных назіральнікаў запрошаныя толькі палітычна ангажаваныя.

**Выбарчыя камісіі**

- Агульныя ўмовы і рэальная працэдура фармавання тэрытарыяльных і ўчастковых выбарчых камісій (ТВК і УВК), што з'яўляюцца важным механізмам выбарчага працэсу, прадэманстравалі дзяржаўны дырыжызм усіх выбарчых працэсаў пры імітацыі актыўнага ўдзелу грамадзянскай супольнасці, што дало поўны кантроль дзеючай выканаўчай уладзе над сфармаванымі камісіямі.

- Фармаванне ТВК і УВК праходзіла ва ўмовах, калі сярод двух ключавых актараў грамадзянскай супольнасці – палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў – не засталося арганізацый, якія маглі б выявіць незалежную ініцыятыву. Успадкаваныя з савецкіх часоў "працоўныя калектывы" не з'яўляюцца палітычнымі суб'ектамі і выбарчыя працэсы ад іх імя арганізоўваліся адміністрацыйнымі метадамі. Грамадзяне, таксама надзеленыя правам удзелу ў фармаванні тэрытарыяльных выбарчых камісій, запалоханыя агульнай атмасферай тэрору; супраць людзей, якія паказвалі актыўнасць у мінулыя выбарчыя цыклы, ужываюцца прэвентыўныя рэпрэсіі.

- Магчымасці грамадскага кантролю, незалежнага назірання за працэсам фармавання ТВК і УВК не проста зведзеныя да нуля, але з'яўляюцца дзейнасцю, якая пераследуецца.

- На карысць адміністрацыйна-каманднага кіравання ўсім працэсам сведчыла і агульная спешка: 1,725 чалавек нібыта былі вылучаныя партыямі, грамадскімі аб'яднаннямі, працоўнымі калектывамі і грамадзянамі ўсяго за 1 тыдзень у колькасці, неабходнай для фармавання фактычна ўсіх ТВК у максімальным складзе.

- Агулам было ўтворана 5325 УВК (на 86 менш, чым у адзіны дзень галасавання 2024 г., і на 398 менш, чым на прэзідэнцкіх выбарах 2020 г. (даныя без уліку ўчасткаў за мяжой у 2020 г.)). У іх склад увайшло 56 550 чалавек. Скарачэнне колькасці УВК пры невялікім павелічэнні сярэдняй колькасці сябраў камісій азначае, што скарочаныя малалікія ўчасткі, то-бок гэты працэс можна ахарактарызаваць як узбуйненне выбарчых участкаў; такая аптымізацыя адлюстроўвае дэмаграфічныя працэсы, але можа ставіць пытанне фізічнай дасягальнасці ўчасткаў;

- Публічна дасягальная была толькі мінімальная інфармацыя як аб магчымасцях вылучэння ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, так і аб пасяджэннях органаў, якія ўтвараюць камісіі, а таксама іх выніках: працэс правядзення пасяджэнняў заставаўся непразрыстым і неканкурэнтным. Пайменныя спісы членаў камісій па-ранейшаму не публікаваліся.

- Ключавым рэсурсам выканаўцаў, якія забяспечваюць правядзенне выбараў* на ўзроўні ТВК і УВК (акрамя пакінутых пасля перарэгістрацыі чатырох палітычных партый, усе з якіх падтрымліваюць курс дзеючай улады), застаюцца пяць найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў (БРСМ, Белая Русь, Саюз жанчын, Саюз ветэранаў, Фонд міру), 4 з якіх маюць з 2023 г. заканадаўча замацаваны асаблівы статус набліжанасці да дзяржавы, і прафсаюзы, якія ўваходзяць у ФПБ. Працэнт "праходнасці" кандыдатаў ад гэтых праўладных партый і грамадскіх аб'яднанняў, якія імітуюць грамадзянскую супольнасць, сумесна фармуюць 63% складаў усіх ТВК, імкнуўся да 100%; ва УВК прадстаўнікі грамадзян

занялі 29,1% месцаў; прадстаўнікі 4 палітычных партый – 9,8%; прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў – 49,4%; прадстаўнікі працоўных калектываў – 11,7%;

- Прыкметная асаблівая роля праўладных прафсаюзаў, якія атрымалі 15,7% месцаў ва УВК, што пацвярджае ролю прафсаюзаў як адной з асноўных крыніц "працоўных рук" для парушэння выбарчага заканадаўства і пры гэтым стварэння карцінкі дэмакратычнага працэсу.

- Ненатуральна выглядалі паводзіны палітычных партый: лідары 3 з 4 партый, якія засталіся ў Беларусі, зарэгістраваныя ў якасці кандыдатаў у прэзідэнты, і было б лагічна бачыць актыўную гатоўнасць запоўніць УВК сваімі прадстаўнікамі, але гэтыя 3 партыі сукупна вылучылі толькі 4,3% ад агульнай колькасці вылучаных прадстаўнікоў. Такія паказчыкі падкрэсліваюць імітацыйны характар удзелу палітычных партый ды іх лідараў у гэтых выбарах*; іх асноўная роля – забеспячэнне легітымацыі працэдуры праз стварэнне карцінкі альтэрнатыўнасці і дэмакратычнасці

- У сітуацыі татальнай зачысткі грамадзянскай актыўнасці асабліва сумнеўнай з'яўляецца заяўленая нізавая актыўнасць грамадзян, якія нібыта вылучылі больш за 16,5 тысяч прадстаўнікоў у сябры УВК, якія сабралі подпісы як мінімум 10 чалавек у падтрымку свайго вылучэння.

- Такім чынам, улічваючы атмасферу агульнай запалоханасці, адсутнасць эфектыўнага інфармавання і вельмі сціснутыя тэрміны, можна канстатаваць, што ў актыўных грамадзян фактычна адсутнічала магчымасць вылучыць сваіх прадстаўнікоў у склад ТВК і УВК. Мэта этапу фармавання выбарчых камісій была хутчэй супрацьлеглая: правесці яго як мага хутчэй і цішэй.

- Захавалася гендарная дыспрапорцыя: доля жанчын (74,8%) у складзе УВК значна перавышае долю мужчын.

- Трэцюю выбарчую кампанію заканадаўства дазваляе не публікаваць пайменныя спісы сябраў УВК. Гэта значна ўскладняе магчымасць ацаніць спецыфіку складу УВК, у прыватнасці тое, наколькі захоўваўся звычайна практыкаваны "вытворчы прынцып" фармавання выбарчых камісій, калі сябры камісіі лічацца прадстаўнікамі розных суб'ектаў (партыі, грамадзяне, грамадскія аб'яднанні), але набраныя з аднаго працоўнага калектыву, а іх непасрэдныя начальнікі з'яўляюцца кіраўнікамі гэтых выбарчых камісіяў;

***Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў***

- Захоўваецца рэпрэсіўная атмасфера пагрозаў, нагнятання страху, ціску і рэпрэсій у сувязі з любой несанкцыянаванай уладамі грамадзянскай актыўнасцю. "Прафілактычныя гутаркі", паўторныя затрыманні людзей, якія паказвалі актыўнасць у перыяд папярэдняй

прэзідэнцкай кампаніі 2020 г., спалучаючца з дэманстрацыяй гатоўнасці жорстка задушыць любыя праявы нелаяльнасці ў дадзенай выбарчай кампаніі. Гэтая атмасфера страху негатыўна ўплывала на шанцы "здаровых" паводзін выбаршчыкаў – якія бачылі рэпрэсіўныя наступствы прастаўлення подпісаў за альтэрнатыўных А. Лукашэнку кандыдатаў у 2020 годзе і не хацелі рызыкаваць, ставіць подпісы за каго б там ні было ў перыяд збору подпісаў у канцы 2024 г.;

- Заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты падалі 11 чалавек (у 2020 г. — 55). ЦВК адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп Дзіяны Кавалёвай (у сувязі з недастатковай колькасцю сябраў ініцыятыўнай групы), Аляксандра Драздова і Віктара Куляша (у сувязі з невыкананнем патрабаванняў па спісе сябраў ініцыятыўнай групы), Юрыя Губарэвіча (у сувязі з накіраваннем дакументаў па электроннай пошце, што не прадугледжана выбарчым заканадаўствам).

- ЦВК зарэгістравала 7 ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты — Аляксандра Лукашэнкі (дзеючага прэзідэнта), Алега Гайдукевіча (старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі), Аляксандра Хіжняка (старшыні Рэспубліканскай партыі труда і справядлівасці), Вольгі Чамаданавай (начальніцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама), Ганны Канапацкай (індывідуальнай прадпрымальніцы), Сяргея Бобрыкава (старшыні Рэспубліканскага савета грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз афіцэраў"), Сяргея Сыранкова (першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі). Пазней было абвешчана, што В. Чамаданава і С. Бобрыкаў падалі заявы аб спыненні працы сваіх ініцыятыўных груп. Ніхто з гэтых кандыдатаў не вылучыўся як відавочная альтэрнатыва А. Лукашэнку, хутчэй за ўсе яны былі запланаваныя як "спарынг-партнёры", якія мусілі забяспечыць фармальную альтэрнатыўнасць у бюлетэні.

- Захаванне ў заканадаўстве дазволу збіраць подпісы на тэрыторыях прадпрыемстваў і ўстаноў ўмацавала механізм адміністрацыйна-каманднага прымусу да падпісання ў падтрымку А. Лукашэнкі і ў некаторых выпадках паралельна А. Хіжняка і, верагодна, іншых "спарынг-партнёраў". Зборшчыкі подпісаў часта не прад'яўлялі дакументы, інфармацыя для падпісных аркушаў падавалася аддзеламі кадраў бюджэтных установ і дзяржаўных прадпрыемстваў.

- Збор подпісаў прайшоў з сур'ёзнымі парушэннямі стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, у атмасферы запалохвання і прымусу. Дэ-факта ўлады рабілі актыўныя дзеянні па папярэджанні любой патэнцыйнай не санкцыянаванай "зверху" грамадзянскай актыўнасці.

Працэс збору подпісаў выключаў роўнасць кандыдатаў і быў накіраваны на забеспячэнне карцінкі падтрымкі толькі аднаго кандыдата, А. Лукашэнкі, з традыцыйным выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу і прымусу выбаршчыкаў да падпісання за яго вылучэнне кандыдатам. Дадзены этап з'яўляецца самым празрыстым для выканаўчай вертыкалі, калі ўсе прастаўленыя подпісы і адмова іх праставіць мог стаць падставай для палітычна-матываванага пераследу.

- ТВК пацвердзілі збор неабходных 100 тысяч подпісаў усімі пяццю прэтэндэнтамі. Праверка подпісаў, як і раней, адбывалася непразрыста і ў вельмі сціснутыя тэрміны, што выклікае абгрунтаваныя сумневы ў праўдзівасці агучаных лічбаў.

- Часткай фактычна агітацыйнай кампаніі, заклікаанай легітымаваць ідэю шырокай падтрымкі выбаршчыкамі А. Лукашэнкі ўжо на гэтым этапе, з'яўлялася рэкордна высокая колькасць заяўленых подпісаў і розніца паміж нібыта сабранымі подпісамі ў яго падтрымку (больш за 2,5 млн. подпісаў, каля 35% усіх выбаршчыкаў) і подпісамі, сабранымі іншымі кандыдатамі (у межах 112-134 тысячы). Асаблівая роля была адведзена дзяржаўным і праўладным медыя-рэсурсам, асабліва раённым газетам, якія факусаваліся на фактычнай агітацыі за А. Лукашэнку.

- ЦВК зарэгістраваў кандыдатамі і выдаў пасведчанні аб рэгістрацыі 5 прэтэндэнтам: Алегу Гайдукевічу, Ганне Канапацкай, Аляксандру Лукашэнку, Сяргею Сыранкову і Аляксандру Хіжняку на наступны ж дзень пасля пачатку этапу рэгістрацыі, то-бок гэта самая хуткая рэгістрацыя за гісторыю правядзення прэзідэнцкіх выбараў.

***Агітацыя***

- У межах этапу агітацыі павінна была весціся палітычная барацьба паміж кандыдатамі ў прэзідэнты, аднак у сітуацыі імітацыі канкурэнтнасці (большасць кандыдатаў не пазіцыянавалі сябе як рэальную альтэрнатыву А. Лукашэнку, а хутчэй агітавалі за яго, што добра адлюстравана ў заяве С. Сыранкова: "Не вместо, а вместе"), дзеянні ўсіх кандыдатаў, акрамя А. Лукашэнкі, які карыстаўся адміністрацыйным рэсурсам, былі практычна не заўважныя для шырокай аўдыторыі.

- Патрабаванні выбарчага заканадаўства па забеспячэнні публікацыі перадвыбарных праграм і вылучэння эфірнага часу на дзяржаўным радыё і тэлебачанні былі выкананыя, аднак не даводзіцца казаць аб роўнасці кандыдатаў у выкарыстанні СМІ; фармальна праводзіліся тэледэбаты (А. Лукашэнка, як заўсёды, адмовіўся ў іх удзельнічаць). Некаторыя выступы кандыдатаў (А. Гайдукевіч, С. Сыранкоў) утрымлівалі прыкметы распальвання варожасці, забароненай арт. 47 Выбарчага кодэкса.

- Перадвыбарная агітацыя праходзіла ў няроўных умовах: у падтрымку А. Лукашэнкі быў задзейнічаны адміністрацыйны і прапагандысцкі рэсурс вертыкалі ўлады, праўладных грамадскіх арганізацый і дзяржаўных СМІ. Мы можам вылучыць некалькі механізмаў такога злоўжывання: 1) выкарыстанне адміністрацыйных і інфармацыйных магчымасцяў, якія прыкладаюцца да пасады прэзідэнта, як частка агітацыйнай кампаніі А. Лукашэнкі; 2) акцыі ў межах "Марафону адзінства" і раскрутка лозунга "Время выбрало нас!"; 3) Кампанія (флэшмоб) "Надо!"; 4) інфармаванне аб выбарах агулам, якое выкарыстоўваецца для схаванай агітацыі на карысць А. Лукашэнкі; 5) сустрэчы давераных асоб А. Лукашэнкі, многія з якіх з'яўляюцца службовымі асобамі, з прадстаўнікамі працоўных калектываў дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстаноў, у тым ліку ў працоўны час.

- Свядома падтрымоўваная невыразная мяжа паміж выкананнем дзяржаўных абавязкаў і агітацыяй дазволілі А. Лукашэнку сумяшчаць афіцыйныя мерапрыемствы з фактычнай агітацыяй, карыстаючыся прывілеямі шырокага інфармацыйнага абслугоўвання пасады прэзідэнта за дзяржаўны кошт; таксама прынятае А. Лукашэнкам ў афіцыйнай якасці прэзідэнта рашэнне аб павышэнні пенсій падчас выбараў, можа разглядацца як подкуп выбаршчыкаў і з'яўляецца формай выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу.

- Маштабная прапагандысцкая кампанія "Марафон адзінства", якая доўжылася 4 месяцы, забяспечаная дзяржаўным фінансаваннем (сума выдаткаў ацэньваецца ў больш чым 3,5 млн рублёў), фактычна была перадвыбарнай кампаніяй А. Лукашэнкі. Лозунг перадвыбарнай кампаніі А. Лукашэнкі "Время выбрало нас!" прасоўваўся з дапамогай УНС, "Марафону адзінства", штодзённага "гістарычнага" тэлепраекта "Время выбрало нас!" на тэлеканале Беларусь 1.

- Імітацыя палітычнай актыўнасці і шырокай народнай падтрымкі, а таксама дадатковыя рэсурсы на агітацыю былі атрыманыя А. Лукашэнкам дзякуючы флэшмобу "Надо!", які падаваўся як стыхійная кампанія падтрымкі А. Лукашэнкі, але меў прыкметы арганізаванага мерапрыемства, больш за тое, мерапрыемства, да ўдзелу ў якім прымушаюць.

- Гэтак жа як і на выбарах*2024, адукацыйна-асветніцкія мерапрыемствы пра выбары падмянялі сабой жывы палітычны працэс. Але нават у межах такіх "агульных" словаў пра важнасць выбараў і пра абавязак выбаршчыкаў узяць удзел у выбарах (з акцэнтам на датэрміновым галасаванні, які захоўваўся), знаходзілася месца для ўскоснай агітацыі за А. Лукашэнку (заявы аб правільнасці "абранага курсу" і неабходнасці падтрымліваць "нацыянальнага лідара").

● У адсутнасць незалежных назіральнікаў і дастатковай празрыстасці працэсу паступлення і расходавання сродкаў у выбарчых фондах кандыдатаў, ажыццявіць паўнавартаснае назіранне за фінансавым бокам выбараў немагчыма. Пры гэтым, афіцыйна заяўленыя выдаткі ўсіх кандыдатаў (уключна з А. Лукашэнкам) істотна ніжэй вызначанага ліміту ў 420 000 руб. Нават сума, выдаткаваная з фонду А. Лукашэнкі (105.588,87 руб.), відавочна малая для разгортвання паўнавартаснай агітацыйнай кампаніі па ўсёй краіне.

***Галасаванне і вынікі***

● Пасля шырока аспрэчаных вынікаў папярэдніх прэзідэнцкіх выбараў, А. Лукашэнку было важна паказаць падтрымку выбаршчыкаў і тым самым легітымаваць сваё знаходжанне ва ўладзе. Яўка ў традыцыях аўтарытарнай дзяржавы разглядаецца як доказ легітымацыі нароўні з набранымі галасамі. Верагодна, важнай задачай дэманстрацыі "перагорнутай старонкі", г. зн. утрымання кантролю над краінай, з'яўляюцца паказчыкі і па яўцы, і па выніку больш, чым на выбарах 2020 г.

● Улады прыкладвалі намаганні для арганізацыі рэальнай яўкі (выкарыстоўваючы адміністрацыйны ціск), але яшчэ больш інтэнсіўна арганізоўвалася інфармацыйная карцінка масавай актыўнасці выбаршчыкаў (інфармацыйныя мерапрыемствы вакол выбараў* ды іх медыйнае асвятленне актыўна стваралі "атмасферу свята" і масавай падтрымкі А. Лукашэнкі).

● Як і ў папярэднія выбарчыя кампаніі, датэрміновае галасаванне мела адміністрацыйна-мабілізацыйны, прымусовы і справаздачны характар. Нягледзячы на тое, што Выбарчы кодэкс вызначае датэрміновае галасаванне як экстраардынарныя захады, якія павінны выкарыстоўвацца пры немагчымасці выбаршчыка прагаласаваць у асноўны дзень, улады заклікалі і прымушалі галасаваць датэрмінова; афіцыйная яўка выбаршчыкаў на датэрміновае галасаванне склала рэкордныя 41,81% (48,8% ад усіх тых, хто прагаласаваў).

● Выбары*2025 праходзілі ва ўмовах узмоцненай і відавочна празмернай прысутнасці сілавых структур: на ўсіх участках для галасавання знаходзілася некалькі супрацоўнікаў міліцыі, было ўстаноўлена відэаназіранне і "трывожныя кнопкі" для сябраў камісій, участкі былі абсталяваныя адкрытымі кабінкамі, якія дазваляюць сачыць за тым, што ў іх адбываецца.

● Асноўнае парушэнне выбарчага заканадаўства, пра якое актыўна папярэджвалі ўсе задзейнічаныя ў інфармацыйным абслугоўванні выбарчай кампаніі, і факты якія актыўна агучваюцца — фатаграфаванне

бюлетэня (менавіта фатаграфаванне бюлетэняў у 2020 г. дазволіла выявіць факты масавай фальсіфікацыі вынікаў выбараў).

● Папярэднія вынікі галасавання па ўсёй краіне былі агучаны ЦВК праз 6 гадзін пасля закрыцця ўчасткаў.

● Падлік галасоў па-ранейшаму насіў непразрысты характар, даныя па выбарчых участках не апублікаваныя.

● Пры нібыта вялікай адкрытасці ЦВК і наяўнасці інфармацыі па выбарах на яе сайце і аператыўнага інфармавання ў тэлеграм-канале, ніякія даныя не прадастаўляюцца ЦВК у машыначытальным выглядзе (усе табліцы пададзеныя ў выглядзе pdf файлаў); многія даныя ЦВК змяняе, не паказваючы на факт іх карэкціроўкі.

## 1. СІТУАЦЫЯ НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ

Сёмыя ў гісторыі незалежнай Беларусі выбары праводзіліся ва ўмовах сістэмных рэпрэсій, што закранаюць усе сферы грамадскага жыцця, адсутнасці магчымасцяў для палітычнай канкурэнцыі і татальнай падкантрольнасці электаральных працэдур дзеючай улады.

Сітуацыя з рэалізацыяй правоў чалавека рэзка пагоршылася пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 г. і масавых пратэстаў супраць фальсіфікацыі выбараў і ўжывання сілы ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў. Улады разгарнулі сістэматычную кампанію па ўціску любых формаў іншадумства, у выніку якой напярэдадні чарговых прэзідэнцкіх выбараў 2025 года ў месцах несвабоды ўтрымліваліся ва ўмовах, блізкіх да катавальных, 1300 палітвязняў,[3] умацавалася атмасфера страху, што ўціскала любую незалежную грамадзянскую і палітычную ініцыятыву.[4] Грамадска-палітычнае поле краіны выпусташанае: былі ліквідаваныя не менш за 1800 некамерцыйных арганізацыяў[5] (у той жа час актыўнасць грамадзянскай супольнасці імітуецца праз дзяржаўную падтрымку GONGO), з дапамогай выкарыстання адвольнай працэдуры перарэгістрацыі ўлады пакінулі ўсяго 4 лаяльныя дзеючаму рэжыму палітычныя партыі). Практычна ўсе незалежныя СМІ былі вымушаныя спыніць сваю дзейнасць у краіне, пры гэтым улады ўскладняюць доступ да інфармацыі як з боку журналістаў, так і з боку аўдыторыі ўнутры краіны з дапамогай адвольнага ўжывання

---

[3] *Сітуацыя перад выбарамі*2025. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"*, с.4: https://elections2025.spring96.org/be/news/116621

[4] З пачатку 2024 года было затрымана не менш за 1800 чалавек. Не змяншаецца маштаб крымінальнага пераследу паводле палітычных матываў: з лістапада 2023 па кастрычнік 2024 гг. распачатыя крымінальныя справы як мінімум супраць 2300 чалавек; па стане на 1 лістапада 2024 г. крымінальны пераслед спазналі як мінімум 7447 чалавек. Не спыняецца ціск на палітвязняў, у тым ліку шляхам ужывання катаванняў і дадання новых тэрмінаў пазбаўлення волі нібыта за парушэнне правілаў унутранага распарадку ў калоніях. Гл. *Сітуацыя перад выбарамі*2025. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"*, с. 5: https://elections2025.spring96.org/be/news/116621

[5] Lawtrend, *НКО в Беларуси: ситуация с регистрацией и ликвидацией*: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/nko-v-belarusi-situatsiya-s-registratsiej-i-likvidatsiej

экасістэмы "антыэкстрэмісцкага" заканадаўства.[6]

Сістэмныя рэпрэсіі нацэленыя на іншадумцаў і на групу, якая пашыраецца, з тых, каго дзяржава ўспрымае ў якасці такіх. Улады паранейшаму пераследуюць людзей, якія ўдзельнічалі ў мірных пратэстах 2020 г., тых хто так ці інакш браў удзел у папярэдняй прэзідэнцкай кампаніі (у тым ліку ў якасці сябраў ініцыятыўных груп альтэрнатыўных кандыдатаў, незалежных назіральнікаў, і гэтак далей) — уключна з тымі, хто законна выказаў сваю волю, паставіўшы подпіс за вылучэнне альтэрнатыўнага кандыдата.[7] Ключавыя апазіцыйныя ўдзельнікі папярэдняй прэзідэнцкай кампаніі знаходзяцца ў зняволенні або ў вымушанай эміграцыі.[8] Службовыя асобы, праўладныя СМІ адкрыта выкарыстоўваюць мову варожасці ў дачыненні да іншадумцаў.[9] У падобных умовах адкрытае абмеркаванне ключавых палітычных пытанняў для грамадства, неабходнае пры арганізацыі свабодных і канкурэнтных выбараў, з'яўляецца немагчымым.

Заканадаўчыя змены яшчэ больш ускладнілі доступ да вылучэння апазіцыйных кандыдатаў на пасаду прэзідэнта, незалежных кандыдатаў у сябры выбарчых камісій і назіральнікі. Паводле розных ацэнак, каля 500 000 грамадзян,[10] вымушаных пакінуць Беларусь з прычыны боязі палітычнага пераследу, пазбаўленыя магчымасці прагаласаваць за межамі краіны.

Выбары былі прызначаныя за 6 месяцаў да чаканай даты іх правядзення: улады пакінулі на ўсе электаральныя працэдуры толькі 95 дзён, парушыўшы тым самым выбарчае заканадаўства ў аспекце роўнасці магчымасцяў кандыдатаў і прынцыпу прадказальнасці выбараў, прадугледжаных міжнароднымі стандартамі ў гэтай сферы. Гатоўнасць правесці кампанію ў падобнай спешцы з улікам агульнага палітычнага

---

[6] БАЖ, *Электронны бюлетэнь «СМІ ў Беларусі» №3 (77) 2024:* https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/jelektronny-bjuletjen-smi-belarusi-3-77-2024/

[7] Вясна, *Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2024 годзе*: https://spring96.org/be/news/117166 ; *Беларусь пад ціскам рэпрэсій: у якіх умовах праходзяць выбары*2025*, 26.01.2025: https://spring96.org/be/news/117285

[8] Сярод 1300 палітвязняў, якія знаходзіліся напярэдадні выбараў* у месцах несвабоды — экс-прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта Віктар Бабарыка (асуджаны на 14 гадоў пазбаўлення волі), Сяргей Ціханоўскі (асуджаны на 19 гадоў і 6 месяцаў), і шэраг сябраў іх штабоў, у прыватнасці Марыя Калеснікава (асуджаная на 11 гадоў), якія ўтрымліваліся ў рэжыме інкамунікада больш за год, што раўназначна гвалтоўнаму знікненню. Экс-кандыдат Андрэй Дзмітрыеў таксама сутыкнуўся з крымінальным пераследам і быў пазбаўлены волі на 1 год і 6 месяцаў. Святлана Ціханоўская і Валерый Цапкала, якія знаходзяцца ў вымушанай эміграцыі, завочна асуджаныя да 15 і 17 гадоў пазбаўлення волі адпаведна, Вераніка Цапкала таксама завочна асуджаная да 12 гадоў пазбаўлення волі. Глядзі справаздачу *Сітуацыя перад выбарамі*2025. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары"*, с.4: https://elections2025.spring96.org/be/news/116621

[9] Тамсама; MediaIQ, *«Они не беларусы». Зачем депутатка разжигает на ТВ вражду к эмигрантам,* 08.08.2024: https://mediaiq.info/oni-ne-belarusy-zachem-deputatka-razzhigaet-na-tv-vrazhdu-k-emigrantam, *Выборы-2025 в беларусском Telegram: две реальности и борьба нарративов,* 20.01.2025: https://mediaiq.info/vybory-2025-v-belarusskom-telegram-dve-realnosti-i-borba-narrativov

[10] PACE, *Belarusians in exile: an overlooked issue addressed by the Parliamentary Assembly,* 25.01.2025: https://pace.coe.int/en/news/8955/belarusians-in-exile-an-overlooked-issue-addressed-by-the-parliamentary-assembly

кантэксту з'яўляецца дадатковым сведчаннем татальнага адміністрацыйнага кантролю над электаральным працэсам.

Такім чынам, напярэдадні выбараў*2025 склалася сітуацыя, у якой арганізацыя сапраўды ўсеагульных (з забеспячэннем эфектыўнай магчымасці для волевыяўлення ўсіх грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам), канкурэнтных (з забеспячэннем эфектыўнай магчымасці скарыстацца пасіўным выбарчым правам у адсутнасць беспадстаўных абмежаванняў апошняга) выбараў з магчымасцю свабоднай палітычнай дыскусіі з улікам дзеючага заканадаўства і рэпрэсіўных практык з'яўляецца немагчымай.

## 2. НАЗІРАННЕ ЗА ВЫБАРАМІ*

### 2.1. Умовы назірання

Зачыстка грамадзянскай супольнасці ды атмасфера страху, створаная ўладамі, прывялі да адсутнасці паўнавартаснага незалежнага назірання на выбарах*2025. За некалькі месяцаў да даты выбараў* улады, як і перад папярэднімі выбарамі*,[11] разгарнулі кампанію запалохвання грамадзян, раней палітычна актыўных або тых, што ўспрымаліся ўладамі як нелаяльныя.[12]

Як і ў выпадку з прэзідэнцкімі выбарамі 2020 года,[13] улады Беларусі не накіравалі своечасова запрашэнне праз БДІПЧ дзяржавам-удзельніцам АБСЕ назіраць за прэзідэнцкімі выбарамі*2025, адпаведна місія назіральнікаў ад БДІПЧ АБСЕ ў Беларусі не працавала.[14]

Кампанія "Праваабаронцы за свабодныя выбары" ажыццяўляла экспертны маніторынг за выбарамі*2025 ва ўмовах пераследу з боку ўладаў Беларусі, адсутнасці магчымасці накіраваць назіральнікаў і крайняй непразрыстасці ўсіх этапаў выбараў*. Магчымасці грамадскага кантролю, незалежнага назірання за ўсімі этапамі выбараў* былі не проста зведзены да нуля, але з'яўляюцца дзейнасцю, якая пераследуецца. Па-за доступам назіральнікаў быў працэс вылучэння кандыдатаў у выбарчыя камісіі грамадскімі аб'яднаннямі.[15] У адрозненне ад умоваў назірання за выбарамі

---

[11] *Выбары*2024. Выніковая аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года,* с.11-12: https://elections2024.spring96.org/be/news/114854

[12] Вясна, *Мінімум 1213 адміністрацыйна асуджаных: у Беларусі перад прэзідэнцкімі выбарамі ўзмацніліся рэпрэсіі*, 14.11.2024: https://spring96.org/be/news/116697

[13] Вясна, *Назіральнікі ад ПАСЕ не прыедуць на прэзідэнцкія выбары ў Беларусі*, 21.07.2020: https://elections2020.spring96.org/be/news/98367

[14] Парламентская Ассамблея ОБСЕ, *Наблюдатели ОБСЕ не будут наблюдать за выборами в Беларуси из-за отсутствия приглашения в нарушение обязательств, принятых в рамках ОБСЕ,* 09.01.2025: https://www.oscepa.org/ru/novosti-i-multimedia/press-relizy/2024/nablyudateli-obse-ne-budut-nablyudat-za-vyborami-belursi-iz-za-otsutstviya-priglasheniya-chto-yavlyaetsya-narusheniem-obyazatelstov-prinyatykh-v-ramkakh-obse

[15] Пастанова ЦВК ад 24.10.2024 № 69 «О разъяснении порядка образования комиссий по выборам Президента Республики Беларусь», п. 8: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post69-2025.pdf

2020 г.,[16] быў закрыты для магчымасці назірання працэс іх утварэння на пасяджэннях выканаўчых органаў: публічна не былі даступныя ні анлайн-трансляцыі,[17] ні наступныя поўныя відэазапісы пасяджэння, ні запрашэнні на пасяджэнні без анлайн трансляцыі і запісу. Заставаўся непразрыстым працэс праверкі сапраўднасці сабраных подпісаў выбаршчыкаў: без незалежных назіральнікаў і ў вельмі сціснутыя тэрміны. Паўнавартаснае назіранне за паступленнямі і расходаваннямі выбарчых фондаў было немагчымае, у публічным доступе на сайце ЦВК былі толькі кароткія дадзеныя аб агульных сумах паступленняў і выдаткаў, прадастаўленыя не ў машыначытальным выглядзе, без захавання архіва папярэдніх паведамленняў і з недакументаванымі карэкціроўкамі даных за адны і тыя ж дні.

### 2.2. Дзейнасць акрэдытаваных назіральнікаў

У якасці нацыянальных (мясцовых) назіральнікаў за выбарамі*2025 ТВК і УВК акрэдытавалі 44 361 чалавека,[18] у якасці міжнародных назіральнікаў ЦВК акрэдытавала 486 чалавек.[19] Звесткі аб акрэдытаваных назіральніках публічна даступныя толькі ў выглядзе кароткай статыстыкі.

Больш за палова ўсіх нацыянальных назіральнікаў вылучана праўладнымі грамадскімі аб'яднаннямі (GONGO) і вельмі малая колькасць – партыямі, нягледзячы на тое, што 2 з 5 кандыдатаў у прэзідэнты – партыйныя.

[16] Пастанова ЦВК ад 08.05.2020 № 13 (у рэд. пастановы ЦВК ад 15.05.2020 №24), п. 8: https://rec.gov.by/files/2020/post13.pdf

[17] Рэгуляванне выбараў 2020 г.: пастанова ЦВК ад 8 траўня 2020 г. № 13 (у рэд. пастановы Цэнтральнай камісіі ад 15.05.2020 № 24), п. 8: https://rec.gov.by/files/2020/post13.pdf

[18] ЦВК, Сведения о наблюдателях, аккредитованных комиссиями: https://rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/stat6-7.pdf

[19] ЦВК, Сведения об иностранных (международных) наблюдателях, аккредитованных Центральной избирательной комиссией Республики Беларусь при проведении выборов Президента Республики Беларусь 26 января 2025 г.:https://rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/nabl_mezh.pdf




Падобныя паказчыкі прадстаўніцтва і ў спісе нацыянальных назіральнікаў, накіраваных на пасяджэнне ЦВК у дзень выбараў: з 7 назіральнікаў 6 – прадстаўнікі GONGO, 1 – ад партыі.[20] Гэта пацвярджае адсутнасць рэальнай канкурэнцыі на выбарах.

З 486 міжнародных назіральнікаў, як і на выбарах*2024,[21] больш за палову – ад СНД.

[20] ЦВК, Сведения о наблюдателях, направленных на заседания Центральной избирательной комиссии Республики Беларусь, при проведении выборов Президента Республики Беларусь 26 января 2025 года: https://rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/nabl_nac.pdf

[21] *Выбары*2024. Выніковая аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года,* с. 14: https://elections2024.spring96.org/be/news/114854

# Міжнародныя назіральнікі




Міжнародныя назіральнікі ўдзельнічалі ў шматразовых сустрэчах з ЦВК[22] і наведваннях Назіральнага цэнтра,[23] праводзілі фактычна сумесныя з ЦВК прэс-канферэнцыі,[24] давалі каментары дзяржСМІ.[25]

20 лістапада 2024 г. старшыня ЦВК Ігар Карпенка абвясціў, што "плануецца стварэнне грамадскага назіральнага цэнтра, які размесціцца ў Палацы прафсаюзаў", які прэс-служба ЦВК назвала "Інфармацыйны цэнтр ЦВК Беларусі".[26] У рэчаіснасці, Назіральны цэнтр быў створаны падчас выбараў*2024, яго дзейнасць асвятляў Telegram-канал "Ведётся наблюдение", дзе рабіўся акцэнт на актыўнасць акрэдытаваных назіральнікаў і трансляваўся праўладны парадак дня.[27] Па заканчэнні выбараў*2024 гэты канал быў перайменаваны ў "Народный контроль", новай задачай канала быў заяўлены грамадзянскі кантроль за выкананнем

[22] Напрыклад: ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Иностранные (международные) наблюдатели посещают ЦИК Беларуси,* 26.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3310
[23] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *Снова встречаем гостей! Центр общественного наблюдения посетили наблюдатели из России*, 26.01.2024: https://t.me/vedetsyanablyudenie/391
[24] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Работа с международными наблюдателями продолжается,* 23.12.2024: https://t.me/cikbelarus/3058
[25] БелТА, *"Все четко". Как международные наблюдатели оценивают выборы в Беларуси*, 26.01.2025: https://belta.by/society/view/vse-chetko-kak-mezhdunarodnye-nabljudateli-otsenivajut-vybory-v-belarusi-691469-2025/
[26] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *24 января в Минске начнет работу Информационный центр ЦИК Беларуси*, 20.11.2024: https://t.me/cikbelarus/2885
[27] *Выбары*2024. Выніковая аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года*, с. 13: https://elections2024.spring96.org/be/news/114854

працоўных правоў,[28] з'явілася інстытуцыянальная афіліяцыя з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі.[29] Такім чынам, у аднаўленага для выбараў*2025 Назіральнага цэнтра, які павінен аб'ядноўваць усіх нацыянальных назіральнікаў, прасочваецца відавочная афіліяцыя з ЦВК і з праўладнай Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі.

Як ЦВК у апісанні працы Назіральнага цэнтра, так і сам Назіральны цэнтр пазіцыянуе сябе не толькі і не столькі месцам акумулявання вынікаў назірання за выбарамі,[30] колькі своеасаблівай "гарачай лініяй" ЦВК.[31] На практыцы, дадзены рэсурс распавядае аб працы са зваротамі грамадзян, пра тое як "гладка" праходзяць выбары і аб прапагандысцкім наратыве "выбараў-свята".[32] Адзіныя некалькі паведамленняў аб парушэннях – нязначныя парушэнні парадку галасавання з боку выбаршчыкаў, напрыклад, спробы зрабіць фота бюлетэня.[33]

## 3. ПРАВАВАЯ БАЗА

Заканадаўчае рэгуляванне выбараў* у існуючых рэаліях па-ранейшаму перашкаджае правядзенню ўсеагульных і свабодных выбараў, якія адпавядаюць міжнародным абавязальніцтвам Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнцкія выбары*2025 года праводзяцца паводле абноўленага з улікам падзей 2020 года заканадаўства, уключна з канстытуцыйнымі зменамі 2022 г., якія пагаршаюць агульную сітуацыю і новую рэдакцыю Выбарчага кодэкса.

Ключавыя новаўвядзенні, якія ўплываюць на кампанію 2025 года:

- Звузілася кола асоб, якія могуць прэтэндаваць на пасаду прэзідэнта (узроставая планка павышаная з 35 да 40 гадоў, патрабаванне пастаяннага пражывання ў краіне дасягнула 20 гадоў непасрэдна перад выбарамі замест 10, уведзены фільтр наяўнасці замежнага ВНЖ або

[28] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *Выборы завершились. А мы – продолжаем наблюдать и контролировать!*, 13.03.2024: https://t.me/vedetsyanablyudenie/77

[29] Напрыклад: Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *Федерация профсоюзов Беларуси выражает искренние соболезнования …*, 22.03.2024: https://t.me/vedetsyanablyudenie/89

[30] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *Центр общественного наблюдения за выборами принял первые сообщения от наблюдателей*, 21.01.2025: https://t.me/vedetsyanablyudenie/371

[31] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *Принимаем первые звонки на горячую линию Центра общественного наблюдения за выборами*, 21.01.2025: https://t.me/vedetsyanablyudenie/370

ЦВК, Telegram @cikbelarus, *21 января начнет свою работу Центр общественного наблюдения за выборами Президента Республики Беларусь,* 17.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3135

[32] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *Что хотим сказать по итогам досрочного голосования - наши специалисты в Центре немного заскучали,* 26.01.2025: https://t.me/vedetsyanablyudenie/388; *Рабочие будни в Центре общественного наблюдения сменились … свадьбой!*, 25.01.2025: https://t.me/vedetsyanablyudenie/385

[33] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *Внимание! Наблюдатели зафиксировали первые внештатные ситуации во время голосования*, 22.01.2025: https://t.me/vedetsyanablyudenie/378;

*Третий день досрочного голосования отметился некоторыми происшествиями,* 23.01.2025: https://t.me/vedetsyanablyudenie/380;

*7 фактов несоблюдения законодательства зафиксировали вчера наши наблюдатели,* 25.01.2025: https://t.me/vedetsyanablyudenie/384

аналагічнага дакумента замежнай дзяржавы, "які дае права на льготы ды іншыя перавагі").[34] Гэта новаўвядзенне пазбавіла магчымасці балатавацца ў прэзідэнты не толькі грамадзян, якія калі-небудзь пражывалі за мяжой з легалізацыяй свайго статусу з дапамогай атрымання віду на жыхарства або аналагічнага дакумента, але і, у прыватнасці, уладальнікаў "карты паляка", наяўнасць якой разглядаецца ўладамі як маркер патэнцыйнай нелаяльнасці і ўжо служыць падставай для абмежавання шэрагу правоў.[35] Акрамя таго, не мелі магчымасці вылучыцца ў прэзідэнты грамадзяне, у дачыненні да якіх маецца абвінаваўчы прысуд суда,[36] які набыў моц .

- Актыўнага выбарчага права па-ранейшаму пазбаўленыя недзеяздольныя грамадзяне і асобы, якія ўтрымліваюцца паводле прысудаў у месцах пазбаўлення волі (пры гэтым апошнія змены ў Канстытуцыю далі асобам, якія ўтрымліваюцца пад вартай да суда, магчымасць галасаваць).[37] Магчымасці галасаваць па-ранейшаму пазбаўленыя грамадзяне, якія не могуць вярнуцца ў краіну праз боязь адвольнага пераследу паводле палітычных матываў, роўна як грамадзяне, якія лічаць немэтазгодным вяртанне ў краіну выключна для галасавання, паколькі дзяржава адмовілася забяспечваць магчымасць прагаласаваць за межамі Рэспублікі Беларусь, якая раней была ім даступна.[38]
- Захоўваецца празмерна абмяжоўваючае рэалізацыю свабоды асацыяцый заканадаўства,[39] якое ўскладняе рэгістрацыю новых і дзейнасць ужо існуючых палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, уключаючы адвольнае новаўвядзенне аб патрабаванні перарэгістрацыі палітычных партый,[40] што пазбаўляе грамадскае поле суб'ектаў з незалежнай ініцыятывай, якія маглі б удзельнічаць у электаральным працэсе ў тым ліку шляхам накіравання нацыянальных назіральнікаў і кандыдатаў у сябры выбарчых камісій.

---

[34] Артыкул 80 Канстытуцыі.

[35] Кіраўнік МУС у сваіх выказваннях удакладняў, што "карта паляка" ўваходзіць у пералік "іншых дакументаў замежнай дзяржавы, якія даюць права на льготы ці іншыя перавагі" https://belta.by/society/view/grazhdan-belarusi-predlagaetsja-objazat-informirovat-o-priobretenii-drugogo-grazhdanstva-ili-522253-2022/ аб фармаванні асобнай тэндэнцыі дыскрымінацыйнага стаўлення да трымальнікаў "карты паляка" і замежных ВНЖ, гл. . Права человека в Беларуси: основные тренды государственной политики, с. 24-25: https://trends.belhelcom.org/storage/reviews/February2024/gc1hO7866DDq8G3X17sq.pdf

[36] Ч. 7 арт. 60 Выбарчага кодэкса.

[37] Артыкул 64 Канстытуцыі.

[38] З апошняй рэдакцыі Выбарчага кодэкса былі выключаныя палажэнні аб магчымасці стварэння ўчасткаў для галасавання за мяжой: параўн. з арт. 18 Выбарчага кодэкса ў рэдакцыі ад 04.06.2015

[39] *Сітуацыя напярэдадні выбараў*2024. Першая справаздача кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары",* раздзел “Прававая аснова”: https://elections2024.spring96.org/be/news/113485

[40] Перарэгістрацыя стала ключавым рэпрэсіўным інструментам у дачыненні да існуючых партый: у выніку яе ўжывання ў краіне засталіся толькі 4 праўладныя палітычныя партыі: гл. БХК, *Национальный индекс прав человека 2023 (Право на свободу ассоциации)*: https://belhelcom.org/sites/default/files/10._pravo_na_svobodu_associacii_2023.pdf

- Новая версія Канстытуцыі таксама радыкальна змяніла размеркаванне ўладных паўнамоцтваў паміж існуючымі дзяржаўнымі органамі і набылым канстытуцыйны статус "вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя" Усебеларускім народным сходам (УНС). Апошняму нададзеныя шырокія паўнамоцтвы, сярод якіх — права "разглядаць пытанне аб легітымнасці выбараў",[41] уключаючы выбары прэзідэнта,[42] што адкрывае магчымасць для пагарды волевыяўленнем народа — асабліва ўлічваючы непразрысты парадак фармавання гэтага органа і адсутнасць дэталёвага рэгулявання падстаў і працэдур для прыняцця падобнага рашэння.[43] Прэзідэнт цяпер абіраецца на пяцігадовы тэрмін з магчымасцю аднаразовага перавыбрання.[44]

Акрамя вышэйпералічанага, існае рэпрэсіўнае рэгуляванне і практыка яго ўжывання па-ранейшаму пазбаўляюць грамадзян рэальных магчымасцяў для праявы незалежнай ініцыятывы, бяспечнай мабілізацыі палітычных прыхільнікаў, свабоднага выказвання свайго меркавання і рэалізацыі іншых палітычных правоў і свабод. Пастаянна пашырае сваё дзеянне рамка "антыэкстрэмісцкага заканадаўства", якая дазваляе адвольнае абмежаванне шэрагу правоў і свабод на падставе прызнання інфармацыйнай прадукцыі або дзейнасці "экстрэмісцкай",[45] захоўваецца рэгуляванне масавых сходаў, якое супярэчыць міжнародным стандартам, заканадаўчая рамка, якая стварае практычную немагчымасць для дзейнасці незалежных СМІ ў межах юрысдыкцыі дзяржавы,[46] сістэмная адсутнасць гарантый справядлівага судовага разбору незалежным судом,[47] што ў сукупнасці[48] пазбаўляе грамадзян і ключавых палітычных актараў магчымасці паўнавартасна і эфектыўна ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі.

Агулам, існае рэгуляванне электаральных мерапрыемстваў па-ранейшаму супярэчыць міжнародным стандартам і рэкамендацыям БДІПЧ АБСЕ, нацыянальных і міжнародных назіральнікаў[49] у ключавых пытаннях

[41] Ст. 89-3 Конституции.

[42] Арт. 18 Закона "Аб Усебеларускім народным сходзе": https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12300248

[43] Глядзі аналіз гісторыі дзейнасці і механізмаў фармавання гэтага органа: *Усебеларускі народны сход – форма (не)рэалізацыі права прымаць удзел у вядзенні дзяржаўных спраў:* https://elections2024.spring96.org/be/news/115229

[44] Арт. 80 Канстытуцыі пасля змяненняў, унесеных рэферэндумам 27.02.2022.

[45] Вясна, *Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў на падставе барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам*: https://spring96.org/be/news/114917
БАЖ, *Экстремизм и медиа:* https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/ekstremizm-i-media-analitika-bazh/

[46] БАЖ, *Электронны бюлетэнь «СМІ ў Беларусі» №3 (77) 2024:* https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/jelektronny-bjuletjen-smi-belarusi-3-77-2024/

[47] Доклад спецдокладчика ООН по Беларуси, 3 мая 2023, A/HRC/53/53: https://undocs.org/Home/Mobile?FinalSymbol=A/HRC/53/53&Language=E&DeviceType=Desktop&LangRequested=False

[48] БХК, *Национальный индекс прав человека в Беларуси 2023*: https://index.belhelcom.org/

[49] Рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ: https://paragraph25.odihr.pl/search?dayOfElection=2019-11-17T00%3A00%3A00.000Z&numberOfTheRecommendationInTheFinalReport=1&numberOfTheRecommendat

забеспячэння ўсеагульнага, свабоднага, тайнага волевыяўлення. Без увагі застаюцца рэкамендацыі назіральнікаў, якія з'яўляюцца адказам на сістэмныя праблемы, якія неаднаразова адзначаліся:

- забеспячэнне нейтральнага характару дзяржаўнага адміністравання выбараў з дапамогай празрыстага працэсу фармавання выбарчых камісій, гарантый незалежнага назірання на ўсіх этапах выбарчага працэсу, шырокага ўдзелу суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, асабліва палітычных партый, у палітычных працэсах;
- забеспячэнне рэальнага выяўлення волі грамадзян з дапамогай няўхільнага выканання законных працэдур ды іх празрыстасці, асабліва працэдур галасавання і падліку галасоў;
- забеспячэнне свабоднага волевыяўлення без выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу для падтрымкі канкрэтных кандыдатаў, запалохвання, ціску на выбаршчыкаў — пры забеспячэнні свабоды выказвання меркаванняў, асацыяцыі і сходаў для магчымасці рэальнай палітычнай кампаніі;
- забеспячэнне свабоды кандыдатаў, у тым ліку магчымасці самастойна вырашаць пытанне аб вылучэнні, вядзенні кампаніі ў рамках дзеючага заканадаўства і эфектыўным выкарыстанні ўсіх законных формаў і метадаў агітацыі;
- забеспячэнне магчымасці рэалізоўваць выбарчае права (як актыўнае, так і пасіўнае) для ўсіх паўналетніх грамадзян у адсутнасць неабгрунтаваных абмежаванняў, якія супярэчаць міжнародным абавязальніцтвам краіны;
- забеспячэнне захавання нейтральнасці дзяржавы ў электаральным працэсе з гарантыяй роўных умоў для ўсіх кандыдатаў на ўсіх этапах выбараў, уключаючы нейтральнае асвятленне выбарчых працэсаў у СМІ;
- забеспячэнне захавання таямніцы волевыяўлення на ўсіх этапах, уключаючы працэс галасавання.

Нягледзячы на заявы прадстаўнікоў электаральнай адміністрацыі і Міжпарламенцкай асамблеі СНД, дзеючае рэгуляванне і практыка яго ўжывання па-ранейшаму не адпавядаюць, у тым ліку, міжнародным стандартам, што вызначаюцца Канвенцыяй аб стандартах дэмакратычных выбараў, выбарчых правоў і свабод дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаваў.[50]

---

ionInTheFinalReport=55&projectBeneficiary=Belarus&typeOfElection=Parliamentary&yearOfElection=2019&yearOfElection=2019;

рэкамендацыі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары": https://referendum2022.spring96.org/be/news/107872

[50] Як мінімум, застаюцца актуальнымі дэфекты Нацыянальнага рэгулявання, якія супярэчаць згаданай Канвенцыі, апісаныя ў Аналітычнай справаздачы па выніках назірання за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу (2019 г.), с. 11: https://elections2019.spring96.org/ru/news/95164

## 4. ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ

Фармаванне тэрытарыяльных (ТВК)[51] і ўчастковых (УВК)[52] выбарчых камісій праходзіла ва ўмовах, калі сярод двух ключавых актараў грамадзянскай супольнасці — палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў — не засталося арганізацый, якія маглі б выявіць незалежную ініцыятыву.

Ключавую ролю ў камісіях гралі праўладныя структуры: чатыры палітычныя партыі, падкантрольныя ўладам грамадскія аб'яднанні (GONGO)[53] і прафсаюзы. Іх асноўная задача заключалася не ў забеспячэнні дэмакратычнасці працэсу, а ў фармальным стварэнні бачнасці легітымнасці выбараў. У сітуацыі татальнай зачысткі грамадзянскай актыўнасці заяўленае масавае вылучэнне грамадзян і працоўных калектываў[54] у камісіі выглядае сумнеўна, улічваючы агульны клімат рэпрэсій і нізкі ўзровень інфармавання[55] аб правах па ўдзелу ў фармаванні камісій. Працэнт "праходнасці" ў склад камісій кандыдатаў ад гэтых суб'ектаў, якія імітуюць грамадзянскую супольнасць, імкнецца да 100%.

---

[51] *Выбары*2025. Аналітычная справаздача аб утварэнні тэрытарыяльных выбарчых камісій:* https://elections2025.spring96.org/be/news/116671

[52] *Выбары*2025. Аналітычная справаздача аб утварэнні ўчастковых камісій:* https://elections2025.spring96.org/be/news/117092

[53] Сярод прадстаўленых – "Белая русь", "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", "Беларускі саюз жанчын", "Беларускі фонд міру"," Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў" і прафсаюзы, якія ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі. Усе гэтыя пяць грамадскіх аб'яднанняў (акрамя Фонду міру) не проста гонга, але ў адпаведнасці з Законам "Аб асновах грамадзянскай супольнасці" аднесены рашэннем Міністэрства юстыцыі да суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, "якія маюць права на ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) у асаблівых формах", г. зн. іх залежнасць ад дзяржавы замацаваная заканадаўча.

[54] Паводле даных ЦВК, ад грамадзян нібыта вылучаліся 25,68% прадстаўнікоў у склады ТВК, і 29,3% у склад УВК.

[55] Адзінымі крыніцамі канкрэтнай інфармацыі застаюцца сайты мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, прычым адпаведныя даныя знаходзяцца не ў стужцы навін, але за банэрам "Выбары", які можа не ўспрымацца як самастойная ўкладка, у якой знаходзіцца рэлевантная інфармацыя: гл. прыклады тут: https://grodno-region.gov.by/ru, https://minsk.gov.by/ru/




*Праходнасць у тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі*




*Праходнасць ва ўчастковыя выбарчыя камісіі*

У асобных выпадках, калі ў СМІ з'яўляліся імёны прызначаных

старшыняў камісій або мелася фота складу камісіі, можна вызначыць, што склад камісій застаўся практычна нязменным у параўнанні з папярэднімі выбарчымі кампаніямі. Тое ж пацвярджаюць даныя расследавальнікаў, якія раскрылі пайменныя спісы[56] сябраў часткі выбарчых камісій: паведамляецца, што ў 265 УВК 63% сябраў удзельнічалі ў трох апошніх электаральных кампаніях, яшчэ 11% — у адной з іх, і толькі 3% – новых людзей.[57]

Захавалася традыцыйная гендарная дыспрапорцыя ў складзе сфармаваных камісій: доля жанчын у складах ТВК — 67,68%, ва УВК – 74,8%. Пры гэтым, з павышэннем узроўню камісіі прадстаўленасць у іх жанчын змяншаецца (напрыклад, у ЦВК – 33%).

Фармаванне выбарчых камісій прайшло ў адсутнасць магчымасцяў для грамадскага кантролю, а пайменныя спісы сябраў камісій не публікаваліся, што зрабіла выбарчы працэс цалкам закрытым для грамадства.

Пасяджэнні выканаўчых органаў па фармаванні камісій таксама праходзілі ў рэжыме інфармацыйнай цішыні. Паведамленні аб пасяджэннях былі вельмі лаканічныя (паведамленні адлюстроўваліся толькі на прысвечаных выбарам сайтах выканаўчых камітэтаў і не высвечваліся ў стужках галоўных навін).

У цэлым, публічнае асвятленне этапу фармавання камісій было нізкім. Адсутнасць шырокага інфармавання выбаршчыкаў аб правах і магчымасцях па ўдзелу ў фармаванні выбарчых камісій, што паказвае поўную незацікаўленасць уладаў у рэальным удзеле грамадзян у выбарчым працэсе і пацвярджае курс на абсалютны адміністрацыйны кантроль над усімі этапамі выбараў*2025.

## 5. ВЫЛУЧЭННЕ І РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

Заявы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты падалі 11 чалавек (у 2020 г. — 55). ЦВК адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп Дзіяны Кавалёвай (у сувязі з недастатковай колькасцю сябраў ініцыятыўнай групы),[58] Аляксандра Драздова і Віктара Куляша (у сувязі з невыкананнем патрабаванняў па спісе сябраў ініцыятыўнай групы),[59] Юрыя Губарэвіча (у сувязі з накіраваннем дакументаў па электроннай пошце, што не прадугледжана выбарчым заканадаўствам).[60]

---

[56] BELPOL, Telegram @belpol, *База данных о фальсификаторах «безвыборов-2025»,* 22.01.2025: https://t.me/belpol/1010

[57] Позірк, *97% членов избиркомов работало на предыдущих выборах — доклад BelPol,* 26.12.2024: https://pozirk.online/ru/news/119775/

[58] БелТА, *ЦИК отказал в регистрации инициативной группе Дианы Ковалевой для выдвижения кандидатом в Президенты*, 04.11.2024, https://belta.by/society/view/tsik-otkazal-v-registratsii-initsiativnoj-gruppe-diany-kovalevoj-dlja-vydvizhenija-kandidatom-v-673181-2024/

[59] БелТА, *"Несерьезность намерений". ЦИК объяснил причину отказа в регистрации двух инициативных групп*, 29.10.2024, https://belta.by/society/view/neserjeznost-namerenij-tsik-objjasnil-prichinu-otkaza-v-registratsii-dvuh-initsiativnyh-grupp-671767-2024/

[60] Тамсама.

ЦВК зарэгістравала 7 ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты — Аляксандра Лукашэнкі (дзеючага прэзідэнта), Алега Гайдукевіча (старшыні Ліберальна дэмакратычнай партыі Беларусі), Аляксандра Хіжняка (старшыні Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці), Вольгі Чамаданавай (начальніцы галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама), Ганны Канапацкай (індывідуальнай прадпрымальніцы), Сяргея Бобрыкава (старшыні Рэспубліканскага савета грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз афіцэраў"), Сяргея Сыранкова (першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі). Пазней было абвешчана, што В. Чамаданава і С. Бобрыкаў падалі заявы аб спыненні працы сваіх ініцыятыўных груп. Ніхто з вышэйпералічаных кандыдатаў не вылучыўся як відавочная альтэрнатыва А. Лукашэнку, хутчэй за ўсе яны запланаваныя як "спарынг-партнёры", якія мусяць забяспечыць фармальную альтэрнатыўнасць у бюлетэні.

Мясцовыя органы крыху пашырылі пералік месцаў, дзе забаронена пікетаванне па зборы подпісаў выбаршчыкаў за вылучэнне кандыдатаў у прэзідэнты,[61] пры гэтым назіралася некаторая разнастайнасць у трактоўках Выбарчага кодэкса. Аднак з улікам фактычнай безальтэрнатыўнасці выбараў і нізкай актыўнасці выбаршчыкаў, такое скарачэнне месцаў для пікетавання не выклікала рэакцыі кандыдатаў: ніякія ініцыятыўныя групы не скардзіліся на праблемы па зборы подпісаў.

Захаванне ў заканадаўстве дазволу збіраць подпісы на тэрыторыях прадпрыемстваў і ўстаноў умацавала механізм адміністрацыйна-каманднага прымусу да падпісання ў падтрымку А. Лукашэнкі і ў некаторых выпадках паралельна А. Хіжняка і, верагодна, іншых "спарынг-партнёраў". Зборшчыкі подпісаў часта не прад'яўлялі дакументы, інфармацыя для падпісных аркушаў падавалася аддзеламі кадраў бюджэтных устаноў і дзяржаўных прадпрыемстваў.

Такім чынам, збор подпісаў прайшоў з сур'ёзнымі парушэннямі стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, у атмасферы запалохвання і прымусу.[62] Дэ-факта ўлады рабілі актыўныя дзеянні па папярэджанні любой патэнцыйнай не санкцыянаванай "зверху" грамадзянскай актыўнасці. Працэс збору подпісаў выключаў роўнасць кандыдатаў і быў накіраваны на забеспячэнне карцінкі падтрымкі толькі аднаго кандыдата, А. Лукашэнкі,[63] з традыцыйным выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу і прымусу выбаршчыкаў да падпісання за яго

---

[61] Напрыклад: Дадатак да рашэння Мінгарвыканкама 31.10.2024 № 158: https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/vybory_2025/perechen_mest_zapreshenih_dlya_sbora_podpisei.pdf

[62] *Выборы*2025. Аналитический отчет по результатам наблюдения за выдвижением и регистрацией кандидатов,* раздел «Сбор подписей»: https://spring96.org/files/misc/spravazdacha_vybary2025_reg.kand_ru.pdf

[63] *Выборы*2025. Аналитический отчет по результатам наблюдения за выдвижением и регистрацией кандидатов,* с. 10-11: https://spring96.org/files/misc/spravazdacha_vybary2025_reg.kand_ru.pdf

вылучэнне кандыдатам. Дадзены этап з'яўляецца самым празрыстым для выканаўчай вертыкалі, калі ўсе прастаўленыя подпісы і адмова іх праставіць можа стаць падставай для палітычна-матываванага пераследу.

Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі пацвердзілі збор неабходных 100 тысяч подпісаў усімі пяццю прэтэндэнтамі. Праверка подпісаў, як і раней, адбывалася непразрыста і ў вельмі сціснутыя тэрміны, што выклікае абгрунтаваныя сумневы ў праўдзівасці агучаных лічбаў.

Часткай фактычна агітацыйнай кампаніі, закліканай легітымаваць ідэю шырокай падтрымкі выбаршчыкамі А. Лукашэнкі ўжо на гэтым этапе, з'яўляецца рэкордна высокая колькасць заяўленых подпісаў (за ўсе 7 прэзідэнцкіх выбарчых кампаній) і розніца паміж нібыта сабранымі подпісамі ў яго падтрымку (больш за 2,5 млн. подпісаў, каля 35% усіх выбаршчыкаў) і подпісамі, сабранымі іншымі кандыдатамі (у межах 112-134 тысячы).[64] Асаблівая роля была адведзеная дзяржаўным і праўладным медыя-рэсурсам, асабліва раённым газетам, якія сфакусаваліся на фактычнай агітацыі за А. Лукашэнку.[65]




ЦВК зарэгістраваў кандыдатамі і выдаў пасведчанні аб рэгістрацыі 5

[64] ЦВК, Сведения об установлении количества избирателей, поставивших подписи в поддержку выдвижения кандидатом в Президенты Республики Беларусь: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat13.pdf

[65] Праваабаронцы за свабодныя выбары, Пастановачныя кадры, агітацыя ў школе: як на Берасцейшчыне прайшоў збор подпісаў на выбарах*, 06.12.2024, https://elections2025.spring96.org/be/news/116892

прэтэндэнтам: Алегу Гайдукевічу, Ганне Канапацкай, Аляксандру Лукашэнку, Сяргею Сыранкову, Аляксандру Хіжняку на наступны ж дзень пасля пачатку этапу рэгістрацыі, то-бок гэта самая хуткая рэгістрацыя за гісторыю правядзення прэзідэнцкіх выбараў.




## 6. АГІТАЦЫЯ

На этапе агітацыі ў адпаведнасці з заканадаўствам[66] былі апублікаваныя перадвыбарныя праграмы кандыдатаў, паказаны выступленні кандыдатаў[67] на дзяржаўным тэлеканале "Беларусь 1" і прагучалі іх выступленні[68] ў эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага Радыё. Былі праведзены дэбаты, у якіх А. Лукашэнка (як заўсёды) адмовіўся ўдзельнічаць. Пры гэтым не даводзіцца казаць аб роўнасці ўмоў выкарыстання СМІ: у падтрымку А. Лукашэнкі быў задзейнічаны адміністрацыйны і прапагандысцкі рэсурс вертыкалі ўлады, праўладных грамадскіх арганізацый і дзяржаўных СМІ.

Пры аналізе перадвыбарных праграм складваецца ўражанне, што ў

[66] Палажэнне аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, зацверджанае пастановай Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 20 лістапада 2024 г. № 107, п. 1: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post107-2025-red.pdf
[67] Газета «Звязда», 14.01.2025, № 7 (30395): https://zviazda.by/be/pdf?page=1
[68] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Сегодня начинаются предвыборные выступления кандидатов в Президенты Беларуси по ТВ и радио*, 08.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3081

большасці кандыдатаў няма мэты перамагчы на выбарах, пра што і заяўляецца. Напрыклад, С. Сыранкоў паказаў, што *"ідзе на выбары не замест, а разам з Прэзідэнтам Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам"*. У праграмах некаторых кандыдатаў утрымліваюцца прыкметы распальвання варожасці і заклікі да дыскрымінацыі. Напрыклад, кандыдат С. Сыранкоў прапануе *"увесці крымінальную адказнасць за прапаганду і практыку ЛГБТ", а таксама "паглыбіць ачышчэнне сістэмы не толькі дзяржавы, але і ўсяго грамадства ад пярэваратняў, якія займаюць адказныя пасады і гайдалі сістэму ў 2020 годзе і стаіліся, тых, якія чакаюць паслабленняў для аднаўлення сваёй тлятворнай актыўнасці"*. А. Гайдукевіч прапануе *"на заканадаўчым узроўні абмежаваць удзел у выбарах некампетэнтных палітыкаў, здраднікаў, прадстаўнікоў пятай калоны"*. То-бок падкрэслівае, што калі стане прэзідэнтам, то ўвядзе неабгрунтаваныя і дыскрымінацыйныя патрабаванні, якія абмяжоўваюць у выбарчых правах некаторыя пласты насельніцтва Беларусі.

Як і на папярэдніх выбарах*2024, масавых перадвыбарных мерапрыемстваў зафіксавана не было. У асноўным, праводзілі пікетаванне,[69] якое сваёй малалікасцю адлюстроўвала незацікаўленасць выбаршчыкаў у перадвыбарнай кампаніі.

Сустрэчы з выбаршчыкамі ў памяшканнях з'яўляліся найбольш тыповай формай агітацыі,[70] але часцяком публічна пра месца і час правядзення не паведамлялася[71] або паведамлялася постфактум.[72]

Распаўсюджванне агітацыйных матэрыялаў працягнула тэндэнцыю "ціхай" электаральнай кампаніі: у публічнай прасторы практычна не было сутнаснай інфармацыі аб палітычных пазіцыях кандыдатаў. Большая частка візуальных матэрыялаў нагадвала пра дату галасавання і заклікала грамадзян прыйсці на ўчасткі – або ўтрымоўвала інфармацыю агульнага характару аб кожным з кандыдатаў.[73] Складваецца сітуацыя візуальнай "цішыні" ў полі бачнасці грамадзян, якая выключае акцэнт на наяўнасці розных кандыдатаў і прапановах хоць нейкай альтэрнатывы А. Лукашэнку.

Кандыдаты зарэгістравалі давераных асоб (А. Гайдукевіча – 30

[69] Ганна Канапацкая, Telegram @annakanopatskaya, *Уникальная возможность задать Ваши вопросы кандидату в Президенты лично!*, 23.01.2025: https://t.me/annakanopatskaya/187; *Лучшие агитационные пикеты в Минске, это когда участвуют первые лица кампаний*, 16.01.2025: https://t.me/annakanopatskaya/168

Гайдукевіч Алег, Telegram @gajdukevichh, *В Могилёвской области прошли агитационные пикеты за кандидата в Президенты Республики Беларусь Олега ГАЙДУКЕВИЧА*, 06.01.2025: https://t.me/gajdukevichh/8367

[70] Праваабаронцы за свабодныя выбары, Агітацыя па-ціхаму: Румо і выбарчыя сустрэчы ў бальніцах, 15.01.2025: https://elections2025.spring96.org/be/news/117170

[71] Анна Канопацкая, Telegram @annakanopatskaya, *Встреча с работниками ОАО "МТЗ"*, 20.01.2025: https://t.me/annakanopatskaya/181

[72] РПТС Александр Хижняк | Республиканская партия труда и справедливости, Telegram @rpts_by, *Друзья, доброго дня! Короткий дайджест предвыборных встреч*, 18.01.2025: https://t.me/rpts_by/24, https://t.me/rpts_by/28

[73] Зеркало,*«Думаю, что люди сами строем пойдут». Госслужащая рассказала об атмосфере в преддверии выборов*, 20.01.2025, https://news.zerkalo.io/life/88949.html

чалавек,[74] А. Лукашэнкі – 15 чалавек,[75] і Г. Канапацкай – 25 чалавек.[76] У дачыненні да давераных асоб С. Сыранкова і А. Хижняка гіперспасылкі ёсць, але даныя на момант падрыхтоўкі дадзенай справаздачы (27.01.2025), а значыць увесь перыяд агітацыі, не адлюстроўваюцца).[77]

Параўнальна невялікая колькасць давераных асоб у А. Лукашэнкі, у ліку якіх вялікая колькасць высокапастаўленых дзяржслужачых, можа казаць пра тое, што кампанія не патрабуе традыцыйных формаў агітацыі, такіх як шматлікіх сустрэчы з выбаршчыкамі або агітацыя на месцах. Гэта пацвярджае гіпотэзу аб максімальным выкарыстанні адміністрацыйнага рэсурсу і мінімальных выдатках на традыцыйныя кампаніі.

Мелі месца парушэнні абмежаванняў, устаноўленых для давераных асоб: сярод давераных асоб А. Лукашэнкі пазначаны старшыня Белтэлерадыёкампаніі і вядучы тэлепраграмы "Клуб редакторов" Іван Эйсмант[78] і дырэктар – галоўны рэдактар Выдавецкага дома "Беларусь сегодня" Дзмітрый Жук,[79] якія працягвалі весці тэлепраграмы і ўдзельнічаць у асвятленні выбараў. Пасля накіравання скаргі, як паведамляецца,[80] Івана Эйсманта знялі з вядзення праграмы, абедзьве давераныя асобы больш не з'яўляліся ў тэлеэфіры.  Пры гэтым, ні пра сам факт парушэння і скаргу, якая паступіла, ні пра наступствы для кандыдата (аж да зняцця рэгістрацыі) ЦВК не паведамляў, наадварот, 10 студзеня прэс-служба ЦВК паведаміла,[81] што "скаргі аб парушэнні кандыдатамі ды іх даверанымі асобамі заканадаўства ў ЦВК не паступалі".

Асвятленне ў СМІ дзейнасці давераных асоб ажыццяўляецца ў многіх выпадках ананімна: часта не называючы як прозвішча кандыдата, так і прозвішча даверанай асобы.[82] Пры гэтым, MediaIQ адзначае, што ў

---

[74] Пастанова ЦВК ад 23.12.2024 № 135: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post135-2025.pdf
[75] Пастанова ЦВК ад 23.12.2024 № 137: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post137-2025.pdf
[76] Пастанова ЦВК ад 23.12.2024 № 139: https://rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/post139-2025.pdf
[77] Спасылка на інфармацыю аб давераных асобах С. Сыранкова: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post131-2025.pdf,
і А. Хіжняка: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post133-2025.pdf
[78] https://news.by/company/rukovodstvo/eysmont-ivan-mikhaylovich
[79] https://org.sb.by/ru/contacts/
[80] Euroradio, *Кіраўніка БТ Эйсманта знялі з тэлеэфіраў пасля скаргі блогера Малішэўскага,* 22.01.2025, https://euro.radio.fm/kiraunika-bt-eysmanta-znyali-z-teleefirau-paslya-skargi-blogera-malisheuskaga
[81] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *С 1 января начался агитационный период, который завершится 25 января.,* 10.01.2025:https://t.me/cikbelarus/3095
[82] Гомельские ведомости, *Доверенные лица кандидатов в Президенты Республики Беларусь: активные встречи с избирателями в Гомеле*, 23.01.2025, https://newsgomel.by/news/vybory-2025/doverennye-litsa-kandidatov-v-prezidenty-respubliki-belarus-aktivnye-vstrechi-s-izbiratelyami-v-gome_184575.html

"У Гомелі працягваюцца сустрэчы з даверанымі асобамі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у межах перадвыбарнай агітацыі. Гэта важная палітычная падзея прыцягвае ўвагу жыхароў горада, бо выбары прэзідэнта - адна з ключавых падзей у жыцці краіны. На сустрэчы гамяльчане змаглі азнаёміцца з асноўнымі палажэннямі праграмы аднаго з кандыдатаў".

Могилёвские ведомости, *Доверенное лицо кандидата в Президенты Республики Беларусь провел ряд встреч в Могилеве 10 января. Фото*, 11.01.2025, https://mogilevnews.by/news/11-01-2025-09-12/107062

"Даверaная асоба кандыдата ў прэзідэнты Рэспубліке Беларусь правёў 10 студзеня шэраг сустрэч з працоўнымі калектывамі горада Магілёва. Ён сустрэўся з прадстаўнікамі Магілёўскага аблспажыўсаюза,

выпадках асвятлення актыўнасці давераных асоб па ключавых словах і трансляваных наратывах відавочна, што гаворка пра агітацыю за А. Лукашэнку.[83] Такая стратэгія дазваляе праўладным СМІ фактычна агітаваць за "дзейнага прэзідэнта", не называючы імя А. Лукашэнкі, і такім чынам фармальна выконваць забарону на агітацыю[84] і ствараць ілюзію нейтральнага асвятлення выбараў*.

Паводле афіцыйнай інфармацыі[85] ўсе пяцёра кандыдатаў у прэзідэнты адкрылі спецыяльныя выбарчыя рахункі ў банкаўскіх аддзяленнях г. Мінска для фармавання выбарчага фонду ў перыяд з 1 па 11 лістапада 2024 г. Традыцыйна,[86] першым быў адкрыты выбарчы рахунак А. Лукашэнкі.

У адсутнасць дастатковай празрыстасці працэсу паступлення і расходавання выбарчых фондаў, ажыццявіць паўнавартаснае назіранне за фінансавым бокам выбараў немагчыма, але арыентуючыся на кароткія дадзеныя ЦВК (абнаўлення даных па стане на 2 снежня 2025 г. (указаная ЦВК дата абнаўленняў – 27 лістапада 2024 г.), 23 снежня 2024 г. (указаная ЦВК дата абнаўленняў – 11 снежня 2024 г.) і 23 студзеня 2025 г. (указаная ЦВК дата абнаўленняў – 16 студзеня 2025 г.), 25 студзеня апублікаваны абноўлены файл, які прамаркіраваны як даныя за 23 студзеня 2025 г., у ім даныя па некалькіх кандыдатам змененыя, асабліва значныя змены па фонду А. Канапацкай) фіксуецца наступная сітуацыя:

---

абласной клінічнай бальніцы, магілёўскіх электрычных сетак філіяла РУП "Магілёўэнерга". Падчас сустрэчы ў фармаце адкрытага дыялогу гаварылі пра бяспеку і мір, Канстытуцыю, захаванне гістарычнай памяці і важнасць удзелу ў электаральнай кампаніі".

Прыпяцкая праўда, *Доверенное лицо кандидата в Президенты провел встречу с наровлянами,* 23.01.2025, https://narovlya.by/novosti/obschestvo/doverennoe-litso-kandidata-v-prezidenty-provel-vstrechu-s-narovlyanami/

"Падчас сустрэчы жыхары райцэнтра маглі задаць пытанні, якія іх цікавяць. Мерапрыемства прайшло ў пазітыўным ключы. З залы паступіла некалькі пытанняў: аб паляпшэнні іміджу краіны на міжнароднай арэне і прыярытэтах кандыдата для краіны на бліжэйшы час. Давераная асоба адказаў разгорнута, аргументаваўшы кожны тэзіс.

У завяршэнне, давераная асоба заклікаў жыхароў аб'яднацца вакол агульнай мэты - пабудовы моцнай і квітнеючай краіны.

Нараўляне выказалі падзяку за магчымасць пагутарыць і атрымаць разгорнутыя адказы на іх пытанні".

[83] MediaIQ, *Безымянные представители тайного кандидата — о чём говорит тактика анонимного освещения встреч с доверенными лицами кандидатов*, 14.01.2025, https://mediaiq.info/bezymyannye-predstaviteli-tajnogo-kandidata-o-chjom-govorit-taktika-anonimnogo-osveshheniya-vstrech-s-doverennymi-licami-kandidatov

[84] Ч. 1 арт. 46 Выбарчага кодэкса: дзяржаўныя СМІ абавязаны забяспечваць роўныя магчымасці для перадвыбарных выступленняў кандыдатаў і правядзення перадвыбарнай агітацыі

[85] Даныя Беларусбанка: https://belarusbank.by/ru/33139/41509/41530

[86] Патэрн прасочваецца ў чарговасці рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты ды іншых фармальных пералічэннях кандыдатаў.

| | | Лукашэнка А.Р. | Гайдукевіч А.С. | Сыранкоў С.А. | Хіжняк А.М. | Канапацкая Г.А. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 02.12.2024 | Паступіла | 610 120,00 | 3 035,00 | 11 955,00 | 2 150,00 | 12 300,00 |
| | Выкарыстана | 91 333,74 | 140,88 | 0,00 | 0,00 | 8 000,00 |
| | | 15% | 5% | 0% | 0% | 65% |
| 23.12.2024 | Паступіла | 626 060,00 | 6 470,00 | 34 370,00 | 24 760,00 | 19 210,00 |
| | Выкарыстана | 92 032,37 | 140,88 | 20 060,94 | 0,00 | 18 895,00 |
| | | 15% | 2% | 58% | 0% | 98% |
| 23.01.2025 | Паступіла | 634 610,00 | 10 424,88 | 51 771,51 | 39 760,00 | 31 980,00 |
| | Выкарыстана | 92 032,37 | 10 424,88 | 30 965,86 | 10 080,00 | 26 637,60 |
| | | 15% | 100% | 60% | 25% | 83% |
| 23.01.2025 (скарэктаваны) | Паступіла | 634 052,43 | 12 104,88 | 52 911,51 | 39 760,00 | 92 180,00 |
| | Выкарыстана | 105 588,87 | 12 104,88 | 35 985,07 | 10 080,00 | 68 292,60 |
| | | 17% | 100% | 68% | 25% | 74% |




Самы буйны выбарчы фонд быў сфармаваны А. Лукашэнкам, у параўнанні з іншымі кандыдатамі (сярэдні памер фонду – 33484,10 руб.) выбарчы фонд А. Лукашэнкі ў 19 разоў больш, а выдаткі застаюцца на прыкладна аднолькавым узроўні. Марнаванні ўсіх кандыдатаў істотна ніжэй вызначанага ліміту ў 420 000 руб. Нават сума, выдаткаваная з фонду А. Лукашэнкі, відавочна малая для разгортвання паўнавартаснай агітацыйнай кампаніі па ўсёй краіне. Верагодна, асноўная прычына гэтак

невялікіх марнаванняў – гэта актыўнае выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу, які дазваляе весці агітацыю без значных афіцыйных выдаткаў.

Вельмі нізкія сумы выбарчых фондаў, і яшчэ больш нізкія сумы тратаў іншых кандыдатаў дэманструюць адсутнасць рэальнай перадвыбарнай барацьбы.

Маніторынг усёй выбарчай кампаніі, а не толькі агітацыйнага перыяду, які штучна завужаны ў ВК тэрмінам рэгістрацыі кандыдата, і ў які не ўваходзіць, напрыклад, перыяд вылучэння кандыдатаў і збору подпісаў, калі фактычна ідзе актыўная агітацыя, дазваляе канстатаваць шырокае выкарыстанне рэсурсаў усяго дзяржаўнага апарату, многіх бюджэтных арганізацый і прадпрыемстваў, гэтак жа як і лаялісцкіх, прызнаных Мінюстам якія знаходзяцца ў асаблівых адносінах з дзяржавай, грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў для забеспячэння актыўнай інфармацыйнай кампаніі і масавай падтрымкі кандыдатуры А. Лукашэнкі.

Мы можам вылучыць некалькі механізмаў такога злоўжывання:

- выкарыстанне адміністрацыйных ды інфармацыйных магчымасцяў, якія прыкладаюцца да пасады прэзідэнта, як частка агітацыйнай кампаніі;
- акцыі ў рамках "Марафону адзінства" і лозунг "Время выбрало нас!";
- кампанія (флэшмоб) "Надо!";
- інфармаванне аб выбарах агулам, якое выкарыстоўваецца для схаванай агітацыі;
- сустрэчы давераных асоб кандыдата А. Лукашэнкі, многія з якіх з'яўляюцца службовымі асобамі высокага ўзроўню, з працоўнымі калектывамі дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстаноў.

Згодна з артыкулам 77 Выбарчага кодэкса, зарэгістраваныя кандыдаты ў прэзідэнты вызваляюцца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў з дня рэгістрацыі да дня выбараў з прадастаўленнем сацыяльнага адпачынку. Выбарчы кодэкс робіць выключэнне з гэтага патрабавання для прэзідэнта, які балатуецца на новы тэрмін. Карыстаючыся гэтым выключэннем, А. Лукашэнка актыўна выкарыстоўвае перавагі статусу дзеючага прэзідэнта, што ім утрымліваецца, для агітацыі. Ён прама заявіў на сустрэчы сваім даверанымі асобам, што на агітацыйным этапе электаральнай кампаніі *"...вы будзеце галоўнымі дзеючымі асобамі. Шчыра кажучы, у мяне проста на гэта не будзе часу"* патлумачыўшы, што яго працоўны графік у студзені будзе насычаны традыцыйнымі мерапрыемствамі.[87]

***У перыяд агітацыі адсутнічала выразна пэўная мяжа паміж адпраўленнем функцый прэзідэнта і перадвыбарнымі мерапрыемствамі:***

[87] Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь, *Встреча с доверенными лицами*, 03.01.2025, https://president.gov.by/ru/events/vstreca-s-doverennymi-licami

А. Лукашэнка працягваў сваю звычайную дзейнасць, якая станавілася цэнтрам навінавых выпускаў СМІ (Калядная служба,[88] пуск артэзіянскай вады ў Мінску).[89] Згаданая вышэй сустрэча добра ілюструе ўсю кампанію: А. Лукашэнка сустракаецца са сваімі даверанымі асобамі, частка з іх – яго падначаленыя, сустрэча асвятляецца ў СМІ,[90] у матэрыяле яго называюць "кіраўніком дзяржавы", "прэзідэнтам", і ні разу — "кандыдатам у прэзідэнты". А. Лукашэнка ўперамешку ставіць перад імі задачы, якія вынікаюць з дзяржаўнай функцыі і задачы на выбарчую кампанію. Больш за тое, на гэтай жа "сустрэчы з даверанымі асобамі" кандыдат у прэзідэнты аддае распараджэнні ЦВК: "Трэба з Цэнтральнай камісіяй яшчэ раз сустрэцца і вызначыцца, ці будзем мы запрашаць гэтых замежнікаў *(заходніх назіральнікаў. — Заўв. БЕЛТА)* на выбары".[91] Тое, што можна было б назваць сустрэчамі з выбаршчыкамі (як формы агітацыі) — напрыклад, наведванне заводаў, пераплецена з дакладамі чыноўнікаў (відавочна адпраўленне дзяржаўных функцый). Інфармацыя пра такія мерапрыемствы публікуецца не толькі прэс-службай прэзідэнта (у Telegram-канале "Пул первого", на афіцыйным сайце),[92] але і дзяржаўнымі СМІ,[93] а таксама перадрукоўваецца на навінавых стужках дзяржаўных органаў.[94] Пры гэтым амаль на ўсіх заводах А. Лукашэнку ўручалі падарункі.[95] Гэтыя сустрэчы

---

[88] Пул Первого, Telegram @pul_1, *В это праздничное утро Первый едет в Логойск,* 07.01.2025: https://t.me/pul_1/15113, *Будет сделано всё, чтобы в Беларуси сохранился мир. Будем жить, может, небогато, но достойно*, 07.01.2025: https://t.me/pul_1/15117, *30 лет назад я поклялся, что буду служить своему народу. И я это делаю*, 7.01.2025 https://t.me/pul_1/15118

[89] Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь, *Участие в торжественном пуске артезианской воды из подземных источников для обеспечения водоснабжения Минска | Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь,* 10.01.2025: https://president.gov.by/ru/media/details/ucastie-v-torzestvennom-puske-artezianskoj-vody-iz-podzemnyh-istocnikov-dla-obespecenia-vodosnabzenia-minska

Пул Первого, Telegram @pul_1, *Вода - единственный напиток мудрого человека*, 10.01.2025: https://t.me/pul_1/15164 «Первого поблагодарили за поддержку и подарили символический подарок - капсулу с водой из артезианской скважины».

[90] БелТА, *Что самое страшное для Президента и почему выборы в Беларуси - не шоу? О чем говорил Лукашенко с доверенными лицами*, 03.01.2025: https://belta.by/president/view/chto-samoe-strashnoe-dlja-prezidenta-i-pochemu-vybory-v-belarusi-ne-shou-o-chem-govoril-lukashenko-s-686709-2025/

БелТА, *"Главное - не агитация, а обратная связь от народа". Лукашенко провел встречу с доверенными лицами*, 03.01.2025: https://belta.by/president/view/glavnoe-ne-agitatsija-a-obratnaja-svjaz-ot-naroda-lukashenko-provel-vstrechu-s-doverennymi-litsami-686669-2025/

[91] БелТА, *Что самое страшное для Президента и почему выборы в Беларуси - не шоу? О чем говорил Лукашенко с доверенными лицами*, 03.01.2025: https://belta.by/president/view/chto-samoe-strashnoe-dlja-prezidenta-i-pochemu-vybory-v-belarusi-ne-shou-o-chem-govoril-lukashenko-s-686709-2025/

[92] Напрыклад: Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь, *Посещение Минского автозавода,* 21.01.2025: https://president.gov.by/ru/media/details/posesenie-minskogo-avtozavoda

[93] Газета «Звязда», 22.01.2025, № 13 (30401), с. 1: https://zviazda.by/sites/default/files/22stu-1-szhatyy.pdf

[94] Глыбоцкі раённы выканаўчы камітэт, *Лукашенко посетил новое автобусное производство МАЗа*, 22.01.2025: https://glubokoe.vitebsk-region.gov.by/ru/news_republic_ru/view/lukashenko-posetil-novoe-avtobusnoe-proizvodstvo-maza-26714/

[95] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Первому подарили первый мотоцикл, произведенный на новых модернизированных линиях*, 16.01.2025: https://t.me/pul_1/15251 ; Пул Первого, Telegram @pul_1, *Топор, который сделали и передали Президенту молодые ребята из минского автомеханического колледжа,* 22.01.2025: https://t.me/pul_1/15331, *Первому подарили автобус. Первый за подарок поблагодарил и сразу*

рэзка кантрастуюць з сітуацыяй пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, калі падчас выступу А. Лукашэнкі на Мінскім заводзе колавых цягачоў (МЗКЦ) частка прысутных заклікала да яго адстаўкі.[96]

У перыяд агітацыйнай кампаніі, А. Лукашэнка абвясціў аб традыцыйным[97] перад выбарамі рашэнні[98] зрабіць пераразлік працоўных пенсій з 1 лютага 2025 г. з павышэннем яе велічыні на 10 працэнтаў. Такія меры заахвочвання, прынятыя падчас выбарчай кампаніі могуць разглядацца як выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу і, магчыма, подкуп выбаршчыкаў.

Асобна варта паказаць на выкарыстанне рэсурсаў прэс-службы прэзідэнта (і асабліва Telegram-канала "Пул первого" і афіцыйнага сайта прэзідэнта) для мэтаў шырокага распаўсюджвання інфармацыі, у тым ліку і пра тую, што адносіцца да дзейнасці А. Лукашэнкі як кандыдата (напрыклад, кніга "Наш президент").[99] Таксама, пад выглядам нейтральнага прызыву прагаласаваць на выбарах*2025 у першы раз маладым выбаршчыкам БРСМ, а таксама дзяржаўнымі СНУ і ВНУ запушчана кампанія з лозунгамі "Мой голос – первый!"[100] і "Твой голос первый!",[101] якія абыгрываюць назву Лукашэнкі "першым" у рыторыцы дзяржСМІ і прэзідэнцкай прэс-службы. Відэа-ролікі ў сацсетках, якія транслююць гэтыя лозунгі, таксама паўтараюць стандартныя наратывы А. Лукашэнкі, напрыклад "за росквіт нашай краіны", "за Беларусь" і г. д.[102]

За кошт адміністрацыйнага рэсурсу адбывалася "раскрутка" лозунгу "Время выбрало нас!". З 17 верасня 2024 г. па ўсёй краіне праходзілі мерапрыемствы ў рамках "Марафону адзінства" (як указваецца,

---

*поручил передать его государственному учреждению образования «Социально-педагогический центр с приютом Заводского района г. Минска»*, 21.01.2025: https://t.me/pul_1/15314

[96] Meduza, *Лукашенко на заводе тягачей в Минске выступил, пожалуй, со своей самой провальной речью. Мы поговорили с рабочими этого предприятия о том, что там происходило*, 17.08.2020 https://meduza.io/feature/2020/08/17/lukashenko-na-zavode-tyagachey-v-minske-vystupil-pozhaluy-so-svoey-samoy-provalnoy-rechyu-my-pogovorili-s-rabochimi-etogo-predpriyatiya-o-tom-chto-tam-proishodilo

[97] У перыяд выбарчай кампаніі 2020 пенсіі павялічыліся на 6% шляхам падпісання А. Лукашэнкам Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2020 г. № 232 "Аб павышэнні пенсій", Праваабаронцы за свабодныя выбары, Выніковая аналітычная Справаздача па выніках назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 года, ст. 28: https://elections2020.spring96.org/ru/news/100922

[98] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Президент Беларуси 20 января подписал Указ "О повышении пенсий"*, 20.01.2025: https://t.me/pul_1/15293

[99] Пул Первого, Telegram @pul_1, *Президент Беларуси 20 января подписал Указ "О повышении пенсий"*, 20.01.2025: https://t.me/pul_1/15293

[100] Брэсцкі дзяржаўны каледж сувязі, *Мой голос первый!,* 21.01.2025: https://bgks.by/moj-golos-pervyj/;
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, *Мой голос - первый!*, 21.01.2024: https://www.mslu.by/news/moy-golos-pervyy/

[101] Лунінецкія навіны, *«Твой голос первый!». На выборах Президента Республики Беларусь голосует молодёжь*, 22.01.2025: https://lnc.by/news/mikashevichy/tvoy-golos-pervyy-na-vyborakh-prezidenta-respubliki-belarus-golosuet-molodyezh/

[102] БРСМ факультэта пачатковай адукацыі БДПУ, Instagram @brsm.fno_, 22.01.2025: https://www.instagram.com/brsm.fno_/reel/DFIuuy2IJhr/
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, TikTok @vstu_vitebsk, 21.01.2025: https://www.tiktok.com/@vstu_vitebsk/video/7462387285678476550

ініцыяванага А. Лукашэнкам),[103] канцэрты ў яго межах называліся "Время выбрало нас!".[104] "Марафон адзінства" завяршыўся 24 студзеня 2025 года аднайменным гала-канцэртам у "Мінск-Арэне", у прысутнасці больш за 10 тысяч гледачоў і А. Лукашэнкі,[105] які трансляваўся на дзяржаўным тэлеканале "Беларусь 1". Паводле ацэнак незалежных крыніц (на падставе даных аб дзяржаўных закупках) агульная сума выдаткаў на гэты марафон перавышае адзнаку ў 3,5 млн рублёў.[106]

Лозунг "Время выбрало нас!" актыўна тыражаваўся праўладнымі СМІ вясной 2024 года, бо ён быў дэвізам VII Усебеларускага народнага сходу (24-25 красавіка 2024 г.).[107]

На дзяржаўным тэлеканале "Беларусь 1" з 19 лістапада 2024 г. па 23 студзеня 2025 г. кожны дзень(!) у прайм-тайм (21: 30) выходзяць паўтарагадзінныя серыі "гістарычнага" праекта "Время выбрало нас!",[108] прысвечанага найноўшай гісторыі незалежнай Беларусі, увесь наратыў якога зводзіцца да найважнейшай ролі А. Лукашэнкі.

Ад 3 студзеня 2025 публікуецца перадвыбарная праграма а. Лукашэнкі, якая называецца "Время выбрало нас!".[109]

Іншы лозунг, які асацыюецца з выбарчай кампаніяй А. Лукашэнкі — "Надо!". Паводле афіцыйнай версіі[110] ён паўстаў як рэакцыя на словы А. Лукашэнкі падчас інтэрв'ю расійскай журналісцы В. Скабеевай, 23 кастрычніка 2024 года (адказваючы на пытанне пра намер узяць удзел у будучых выбарах): "калі вось Эйсмант і прыхільнікі мае скажуць, што гэта трэба".

Напрыканцы кастрычніка 2024 г. пачаўся флэшмоб "Надо!" — які публікацыямі ў розных фарматах (у тым ліку калектыўных відэа) заклікаў А. Лукашэнку ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах*2025. У флэшмобе

[103] СТВ, Прямую трансляцию гала-концерта «Время выбрало нас» покажет телеканал «Беларусь 1», 24.01.2025: https://ctv.by/news/obshestvo/pryamuyu-translyaciyu-gala-koncerta-vremya-vybralo-nas-pokazhet-telekanal-belarus-1

[104] СТВ, *Прямую трансляцию гала-концерта «Время выбрало нас» покажет телеканал «Беларусь 1»*, 24.01.2025: https://ctv.by/news/obshestvo/pryamuyu-translyaciyu-gala-koncerta-vremya-vybralo-nas-pokazhet-telekanal-belarus-1

[105] СТВ, *10 тысяч зрителей в «Минск-Арене» – масштабный гала-концерт стал финальной точкой «Марафона единства»*, 24.01.2025: https://ctv.by/news/obshestvo/10-tysyach-zritelej-v-minsk-arene-masshtabnyj-gala-koncert-stal-finalnoj-tochkoj-marafona-edinstva

[106] Зеркало, *Беларусов все сложнее удивить, но эта цифра явно может — выяснили, сколько денег взяли из госбюджета на акции, где восхваляют Лукашенко*, 24.01.2025, https://news.zerkalo.io/economics/89410.html?c

[107] БелТА, *Время выбрало нас! Всебелорусское народное собрание пройдет 24-25 апреля во Дворце Республики*, 24.01.2025, https://belta.by/society/view/vremja-vybralo-nas-vsebelorusskoe-narodnoe-sobranie-projdet-24-25-aprelja-vo-dvortse-respubliki-629923-2024/

[108] News.By, *Время выбрало нас*: https://news.by/videogallery/khronikalno-dokumentalnye/vremya-vybralo-nas?page=1, https://news.by/videogallery/khronikalno-dokumentalnye/vremya-vybralo-nas?page=4

[109] Газета «Звязда», 14.01.2025, № 7 (30395), с. 3: https://zviazda.by/sites/default/files/14stu-3.pdf

[110] Беларусь Сегодня, *Что в основе самого консолидирующего флешмоба Беларуси. Надо*, 02.11.2024: https://www.sb.by/articles/nado.html

ўдзельнічалі[111] дзяржаўныя служачыя, супрацоўнікі дзяржаўных і бюджэтных арганізацый і прадпрыемстваў, грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюзаў.[112] Ёсць шмат сведчанняў пра ціск і прымус да ўдзелу ў здымках.[113] А. Лукашэнка крывадушна падкрэслівае стыхійны, нізавы характар гэтай ініцыятывы: *"Я рады гэтаму. Калі гэта такое ўсеагульнае ўхваленне. Але не дай бог гэта арганізаванае нешта"*.[114]

Далей лозунг "Надо!" выкарыстоўваўся ў візуальным афармленні пікетаў па зборы подпісаў за А. Лукашэнку.[115] Пасля рэгістрацыі, працягнулася дваістае пазіцыянаванне гэтага лозунга: нізавы флэшмоб і яго ўжыванне ў айдэнтыцы кампаніі А. Лукашэнка дазваляе бескантрольна выкарыстоўваць рэсурсы многіх арганізацый.[116]

16 студзеня 2025 г. па ўсёй краіне прайшоў "Адзіны дзень інфармавання" на тэму: "Удзел у выбарах – права і грамадзянскі абавязак кожнага", якая раскрываецца не толькі праз асвету аб выбарчых правах, але і дае магчымасць для схаванай і прамой агітацыі. Часты наратыў спікераў – слушнасць абранага 30 гадоў таму курсу, згуртаванасць вакол "нацыянальнага лідара", давер народа да кіраўніка дзяржавы, намёкі пра "правільны выбар" і надалей.[117]

Як і ў папярэдніх кампаніях, ЦВК стварыла[118] Наглядальны савет па

---

[111] Комсомольская правда, *«Если сторонники мои скажут, что это надо...» Белорусы записывают видео со словом «Надо!» в ответ на слова Лукашенко об участии в выборах президента в 2025 году*, 28.10.2024: https://www.belarus.kp.ru/daily/27652/5003775/

[112] Беларускі прафесійны саюз работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, *Профсоюзы говорят: «Надо!»*, 29.10.2024, https://kult.1prof.by/news/no-category/profsoyuzy-govoryat-nado/

[113] Зеркало, *Власти запустили флешмоб: работников госорганизаций и военных заставляют просить Лукашенко баллотироваться на 7-й срок,* 28.10.2024, https://news.zerkalo.io/cellar/81933.html?c

[114] БелТА, *Лукашенко рассказал о своей реакции на флешмоб «Надо!»,* 03.11.2024 : https://belta.by/president/view/lukashenko-rasskazal-o-svoej-reaktsii-na-fleshmob-nado-673001-2024/

[115] Аб'яднаная галіновая прафсаюзная арганізацыя работнікаў НАН Беларусі, *Начался сбор подписей для выдвижения кандидатов в Президенты Республики Беларусь:* https://profnan.by/nachalsya-sbor-podpisej-dlya-vydvizheniya-kandidatov-v-prezidenty-respubliki-belarus/

[116] БРСМ, *"Молодежь голосует!" Тематический стикерпак запущен в Telegram,* 21.01.2025: https://www.brsm.by/ru/patriotic-news-ru/view/molodezh-golosuet-tematicheskij-stikerpak-zapuschen-v-telegram-26109-2025/

[117] Бабруйскі гарадскі выканаўчы камітэт, *Выбор каждого. Единый день информирования с участием Игоря Киселя прошел в троллейбусном парке,* 17.01.2025: https://bobruisk.gov.by/news/gorodskie-novosti/vybor-kazhdogo-edinyy-den-informirovaniya-s-uchastiem-igorya-kiselya-proshel;

Пастаўскі край, *16 января Поставы посетил инспектор по Витебской области Сергей Левкович*, 16.01.2025: https://www.postawy.by/2025/01/16-janvarja-postavy-posetil-inspektor-po-vitebskoj-oblasti-sergej-levkovich/

Бабруйскі гарадскі выканаўчы камітэт, *Сергей Новиков: «Воля белорусского народа – единственная легитимная сила, которая может и должна выбирать судьбу государства»*, 17.01.2025: https://bobruisk.gov.by/news/gorodskie-novosti/sergey-novikov-volya-belorusskogo-naroda-edinstvennaya-legitimnaya-sila

Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, *Участие в выборах – право и гражданский долг каждого. В Президентской Академии прошел Единый день информирования,* 16.01.2025: https://www.pac.by/press-center/news/uchastie-v-viborah-pravo-i-grazhdanskii-dolg-kazhdogo/

Лідскі раённы выканаўчы камітэт, *Александр Версоцкий встретился с коллективом Лидской ЦРБ | Новости района,* 24.01.2025: https://lida.gov.by/ru/lida-news-ru/view/aleksandr-versotskij-vstretilsja-s-kollektivom-lidskoj-tsrb-25554-2025/

[118] Пастанова ЦВК ад 20.11.2024 №104, п. 4: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post104-2025.pdf.

кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў СМІ (Савет). Рэгуляванне складу Савета, працэдуры яго фармавання, спыненне паўнамоцтваў яго сябраў застаюцца нязменнымі і, як мы адзначалі раней,[119] не могуць гарантаваць незалежнасць дадзенага органа. Нягледзячы на тое, што ў тэксце пастановы ЦВК змяшчаецца спасылка на дадатак, які ўдакладняе склад Савета, апублікаваны ЦВК дакумент звестак аб складзе не ўтрымлівае.[120] У іншых адкрытых крыніцах інфармацыя аб складзе Савета і абнаўляльная інфармацыя аб яго дзейнасці, спрэчках, перададзеных на яго разгляд, таксама адсутнічае. У тэлеграм-канале ЦВК апублікаваныя 3 інфармацыйныя нататкі, якія тычацца Наглядальнага савета (аб парадку пасяджэння ЦВК,[121] аб фармаванні — без пайменнага ўказання складу,[122] аб адным пасяджэнні Савета).[123] На гэтым пасяджэнні 23 студзеня з удзелам прадстаўніка ЦВК[124] разгледжана пытанне аб тым, што газеты "Мінская праўда" і "7 дней", 22 і 23 студзеня, апублікавалі апытанні грамадскай думкі, звязаныя з выбарамі, у парушэнне патрабаванняў арт. 46 Выбарчага кодэкса[125] і гэтым друкаваным СМІ вынесеныя папярэджанні.

У незаконнай агітацыі за А. Лукашэнку ўдзельнічаў нават інстытут, створаны ўладамі для дэманстрацыі наяўнасці назіральнікаў — Назіральны цэнтр, мэтай якога абвешчана каардынацыя ўзаемадзеяння ЦВК з нацыянальнымі назіральнікамі і акумулявання вынікаў іх назірання. Толькі ў дачыненні да кандыдатуры А. Лукашэнкі назіральны цэнтр асвятляў працэс збору подпісаў,[126] выніковую колькасць сабраных подпісаў[127] і навіну аб рэгістрацыі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты.[128] Акрамя таго, назіральны цэнтр наўпрост афіляваны з праўладнай Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі і праз яе старшыню Юрыя Сянько – з А. Лукашэнкам,

[119] *Выбары*2024. Аналітычная справаздача па выніках назірання за перадвыбарнай агітацыяй*, с. 15: https://elections2024.spring96.org/be/news/114538
[120] Пастанова ЦВК ад 20.11.2024 №104: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post104-2025.pdf
[121] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *20 ноября состоится заседание ЦИК Беларуси*, 16.11.2024: https://t.me/cikbelarus/2872
[122] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *ЦИК Беларуси утвердил состав Наблюдательного совета по контролю за предвыборной агитацией в СМИ,* 20.11.2024: https://t.me/cikbelarus/2884
[123] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Председатель ЦИК Беларуси Игорь Карпенко: для осуществления контроля за соблюдением порядка и правил проведения предвыборной агитации в средствах массовой информации был создан Наблюдательный совет*, 25.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3259
[124] ЦВК, Telegram @cikbelarus, 25.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3259
[125] Ч. 12 арт. 46 Выбарчага кодэкса: на працягу апошніх пяці дзён да выбараў, рэферэндуму не дапускаюцца апублікаванне, размяшчэнне ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт вынікаў апытанняў грамадскай думкі, звязаных з выбарамі, рэферэндумам, прагнозам іх вынікаў
[126] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie (репост Пул Первого, Telegram @pul_1), *Помните, Первый предлагал остановить (https://t.me/pul_1/14372) сбор подписей в поддержку своей кандидатуры?*, 21.11.2024: https://t.me/vedetsyanablyudenie/326
[127] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *За выдвижение Александра Лукашенко кандидатом в Президенты Республики Беларусь собрано уже более 1,5 млн подписей!*, 21.11.2024: https://t.me/vedetsyanablyudenie/328
[128] Народный контроль, Telegram @vedetsyanablyudenie, *Удостоверение о регистрации Александра Лукашенко кандидатом в Президенты Республики Беларусь по доверенности получил председатель ФПБ Юрий Сенько, 23.12.2024:* https://t.me/vedetsyanablyudenie/355

чыёй даверанай асобай Ю. Сянько з'яўляецца.[129]

## 7. ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

Датэрміновае галасаванне доўжылася 5 дзён:[130] 21-25 студзеня 2025 г. з 12.00 да 19.00 гадзін.

Паводле даных ЦВК у датэрміновым галасаванні прынялі ўдзел 41,81%[131] выбаршчыкаў, што з'яўляецца самым высокім паказчыкам за ўсю гісторыю выбараў. На папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах 2020, яўка склала 41,70%,[132] у 2015 – 36,05%.[133]

| | Выбаршчыкаў агулам (чал.) | 21.01 | прырост | 22.01 | прырост | 23.01 | прырост | 24.01 | прырост | 25.01 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| АГУЛЬНАЕ | 6 900 961,00 | 7,81 | 9,86 | 17,67 | 9,47 | 27,14 | 8,85 | 35,99 | 5,82 | 41,81 |
| Брэсцкая вобласць | 1 000 574,00 | 8,94 | 10,39 | 19,33 | 11,3 | 30,63 | 7,15 | 37,78 | 4,21 | 41,99 |
| Віцебская вобласць | 850 728,00 | 7,45 | 10,9 | 18,35 | 9,12 | 27,47 | 9,05 | 36,52 | 4,99 | 41,51 |
| Гомельская вобласць | 1 054 939,00 | 7,01 | 10,66 | 17,67 | 8,32 | 25,99 | 10,58 | 36,57 | 5,15 | 41,72 |
| Гродзенская вобласць | 754 963,00 | 6,08 | 9,05 | 15,13 | 11,91 | 27,04 | 8,57 | 35,61 | 5,09 | 40,7 |
| Мінская вобласць | 1 143 205,00 | 8,52 | 9,2 | 17,72 | 9,64 | 27,36 | 9,13 | 36,49 | 6,19 | 42,68 |
| Магілёўская вобласць | 788 287,00 | 7,25 | 10,73 | 17,98 | 8,92 | 26,9 | 9,02 | 35,92 | 7,03 | 42,95 |
| г. Мінск | 1 308 265,00 | 8,54 | 8,66 | 17,2 | 8,01 | 25,21 | 11,45 | 33,66 | 7,48 | 41,14 |

Аналіз дынамікі (прыросту) афіцыйна заяўленай яўкі на папярэднім галасаванні ў агульнанацыянальным і рэгіянальным разрэзе дазваляе зрабіць некалькі высноваў:

- прырост няроўны, але 23.01 і 24.01 некаторыя рэгіёны дэманструюць анамальна высокія змены (да 11.9%);
- апошні дзень датэрміновага галасавання (25.01) характарызуецца самым нізкім прыростам яўкі, што наўрад ці звязана з выходным днём (у зімовы перыяд няма масавага ад'езду гараджан на дачы) і можа

[129] Пастанова ЦВК, 23.12.2024 № 137 «О регистрации доверенных лиц кандидата в Президенты Республики Беларусь Лукашенко А.Г.», https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post137-2025.pdf
[130] Ч. 1 арт. 53 Выбарчага кодэкса
[131] ЦВК, Сведения о ходе досрочного голосования: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Pdf/2024/stat20.pdf
[132] ЦВК, Сведения о ходе досрочного голосования, 2020: https://www.rec.gov.by/files/2020/d_gol.pdf
[133] ЦВК, Сведения о ходе досрочного голосования, 2015: https://www.rec.gov.by/uploads/folderForLinks/elections-prb2015-d-gol.pdf

быць звязана са штучным насычэннем або спробай дасягнуць мэтавых паказчыкаў.

Як і ў папярэднія выбарчыя кампаніі, датэрміновае галасаванне мела адміністрацыйна-мабілізацыйны, прымусовы і справаздачны характар. Нягледзячы на тое, што Выбарчы кодэкс вызначае датэрміновае галасаванне як экстраардынарную меру, якая павінна выкарыстоўвацца пры немагчымасці выбаршчыка прагаласаваць у асноўны дзень, улады традыцыйна выкарыстоўваюць кардынальна іншы падыход.

З 21 па 25 студзеня былі зроблены практычныя крокі да арганізацыі масавага ўдзелу ў галасаванні, уключаючы мабілізацыю праваахоўнікаў,[134] вайскоўцаў,[135] спартоўцаў,[136] дзяржслужачых, работнікаў бюджэтных арганізацый і прадпрыемстваў. Актыўна ўдзельнічалі студэнты. Як паведамляе раённая газета "Прысталічча", 22 студзеня на Навасельскім участку для галасавання № 30 свае галасы аддалі прадстаўнікі цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў МУС Рэспублікі Беларусь. У Гомельскім раёне, як піша дзяржаўнае інфармагенцтва "БелТА", асабісты склад тэрытарыяльных войскаў Гомельскага раёна датэрмінова прагаласаваў на выбарчым участку ў аграгарадку Новая Гута. Паведамляецца, што на выбарчых участках у Магілёўскай вобласці прагаласавалі студэнты МДУ імя А. Куляшова, БРУ, архітэктурна-будаўнічага каледжа, курсанты факультэта міліцыі інстытута МУС, а таксама вайскоўцы.[137] У горадзе Круглым паход на датэрміновае галасаванне арганізавалі для супрацоўнікаў мясцовай пракуратуры і раённага выканаўчага камітэта.

Дзяржаўныя медыя і афіцыйныя тэлеграм-каналы і сайты дзяржаўных органаў асвятлялі датэрміновае галасаванне чыноўнікаў і чыноўніц.[138] На афіцыйным тэлеграм-канале ЦВК размешчана навіна аб тым, што старшыня ЦВК Ігар Карпенка разам з сваёй сям'ёй прыняў удзел у датэрміновым галасаванні.[139]

---

[134] Прысталічча, *Как проходит второй день досрочного голосования в Новоселье*, 22.01.2025: https://pristalica.by/22012025/kak-vtoroj-den-dosrochnogo-golosovaniya-prohodit-v-novosele/

[135] Белта, «*Сами выбираем свое будущее». В Гомельском районе досрочно проголосовали участники учебного сбора*, 22.01.2025: https://belta.by/regions/view/sami-vybiraem-svoe-buduschee-v-gomelskom-rajone-dosrochno-progolosovali-uchastniki-uchebnogo-sbora-690594-2025/

[136] Вясна, "Цэлыя сем'і", спартоўцы і назіральнікі ад СНД на ўчастках: як праходзіць трэці дзень датэрміновага галасавання, 23.01.2025: https://elections2025.spring96.org/be/news/117243

[137] Магілёўская Вясна, Telegram @MAYDAYMog, *Магілёўская вобласць – на трэцім месцы па колькасці датэрмінова прагаласаваўшых*, 23.01.2025: https://t.me/MAYDAYMog/4800

[138] Вясна, "Цэлыя сем'і", спартоўцы і назіральнікі ад СНД на ўчастках: як праходзіць трэці дзень датэрміновага галасавання, 23.01.2025: https://elections2025.spring96.org/be/news/117243,

ONT.BY, *В Беларуси завершился первый день досрочного голосования – сюжет ОНТ*, 21.01.2025: https://ont.by/news/v-belarusi-zavershilsya-pervyj-den-dosrochnogo-golosovaniya-syuzhet-ont

«На избирательных участках досрочно голосуют и звезды белорусской эстрады. Композитор, продюсер группы «Аура» Евгений Олейник не изменяет традициям».

[139] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Председатель ЦИК Беларуси Игорь Карпенко прибыл на участок для голосования № 5 Центрального района столицы, 23.01.2025:* https://t.me/cikbelarus/3187; *Председатель*

Ля ўваходу ў будынак, дзе размешчаны выбарчыя ўчасткі, дзяжурылі валанцёры, задача якіх, паводле словаў валанцёраў, складалася ў тым, каб сачыць за парадкам, суправаджаць выбаршчыкаў да ўчасткаў і, растлумачыць парадак галасавання, калі спатрэбіцца.[140]

Практыка па прымусу ды заахвочванню грамадзян за ўдзел у датэрміновым галасаванні традыцыйна працягнулася. Зафіксаваныя выпадкі запалохвання і подкупу выбаршчыкаў. Упершыню прагаласаваўшым сёлета выдаюць сувеніры, у тым ліку — футболкі з айдэнтыкай А. Лукашэнкі з надпісам "Мой голос первый!".[141] Студэнты Мінскай духоўнай семінарыі прагаласавалі датэрмінова,[142] яе адміністрацыя заяўляла аб неабходнасці прагаласаваць на выбарах.

У Івацэвіцкім раёне на выбарах сябры камісіі паказвалі пальцам у бюлетэні, за каго трэба галасаваць.[143] Што сведчыць пра злоўжыванне ўплыву падчас галасавання і парушае права на свабодныя выбары.

За перыяд датэрміновага галасавання вядома пра 12 выпадкаў спробаў сфатаграфаваць бюлетэнь.[144] Колькі з іх прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці[145] – не паведамляецца.

## 8. ГАЛАСАВАННЕ Ў ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ (УКЛЮЧНА З ГАЛАСАВАННЕм ПА МЕСЦЫ ЗНАХОДЖАННЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ) І ПАДЛІК ГАЛАСОЎ

### Яўка

Як адзначалася вышэй, падчас гэтай кампаніі ўлады па-ранейшаму акцэнтавалі ўвагу грамадзян перш за ўсё на неабходнасці прыйсці на ўчасткі — калі не ў дні датэрміновага галасавання, то хаця б у асноўны дзень. Выніковая афіцыйная яўка склала 85,7% — самы высокі адсотак з 2015 г. (тады яўка склала 86.75% пры большай колькасці выбаршчыкаў у спісах —

---

*ЦИК Беларуси Игорь Карпенко досрочно проголосовал на выборах Президента Республики Беларусь*, 23.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3188,

[140] Прысталічча, *Молодежь Сеницы досрочно проголосовала на выборах Президента*, 22.01.2025: https://pristalica.by/22012025/molodezh-seniczy-dosrochno-progolosovala-na-vyborah-prezidenta/
"Дзяўчаткі (заўв. валанцёры) сочаць за парадкам на выбарчым участку і дапамагаюць галасуючым дабрацца да яго без праблем. "Мы ведаем, як дапамагчы падняцца па пандусе тым, каму гэта трэба, тлумачым, што трэба для таго, каб прагаласаваць".

[141] Вясна, "Цэлыя сем'і", спартоўцы і назіральнікі ад СНД на ўчастках: як праходзіць трэці дзень датэрміновага галасавання, 23.01.2025: https://elections2025.spring96.org/be/news/117243

[142] Хрысціянская візія: НЕ ВАЙНЕ!, Telegram @christianvision, *Читатели сообщают, что сегодня студенты Минской духовной семинарии строем ходили досрочно голосовать на «президентских выборах»*, 21.01.2025: https://t.me/christianvision/4195

[143] Вясна, Telegram @viasna96, *У Івацэвіцкім раёне на выбарах* чальцы камісіі паказваюць пальцам у бюлетэні, за каго галасаваць*, 25.01.2025: https://t.me/viasna96/29453

[144] ONT.BY, *Фиксируются отдельные попытки сфотографировать бюллетень на выборах Президента*, 25.01.2025: https://ont.by/news/fiksiruyutsya-otdelnye-popytki-sfotografirovat-byulleten-na-vyborah-prezidenta

[145] У рэдакцыі Выбарчага кодэкса ад 04.03.2023 забараняецца фатаграфаванне бюлетэня: "Забараняецца выносіць выдадзены бюлетэнь за межы памяшкання для галасавання, а таксама ажыццяўляць фота- і відэаздымку запоўненага бюлетэня" (ст. 52)

7 003 777 чалавек).[146] Яўка кампаніі 2025 г. вышэй яўкі 2020 г., што з'яўляецца дадатковым сведчаннем маніпуляцыі з данымі: папярэдняя прэзідэнцкая кампанія адрознівалася фактычна беспрэцэдэнтнай палітычнай мабілізацыяй грамадзян, мноствам чэргаў на выбарчых участках і фіксацыяй назіральнікамі выпадкаў перавышэння 100% яўкі (за кошт маніпуляцыі з яўкай падчас датэрміновага галасавання),[147] у той час як цяперашняя кампанія з улікам вышэйапісанай грамадска-палітычнай сітуацыі і адтоку людзей з краіны, вымяральнага сотнямі тысяч грамадзян, не можа быць аналагічнай.

| | **2024 (прэзідэнцкія выбары)** | **2022 (рэферэндум)** | **2020 (прэзідэнцкія выбары)** | **2019 (выбары ў Палату прадстаўнікоў)** | **2018 (мясцовыя выбары)** | **2016 (выбары ў Палату прадстаўнікоў)** | **2015 (прэзідэнцкія выбары)** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Яўка | 73,09% | 78,70% | 84,38% | 77,40% | 77,23% | 74,7% | 86,75% |
| Колькасць грамадзян у спісах | 6 903 994 | 6 815 635 | 6 904 649 | 6 880 605 | 6 922 768 | 6 978 490 | 7 003 777 |

Высокая наведвальнасць участкаў дэманструецца толькі ў рэпартажах праўладных СМІ (часам — з выкарыстаннем адных і тых жа асоб на розных выбарчых участках).[148]

Дынаміка яўкі падчас асноўнага дня галасавання таксама дэманструе імавернуюштучную прыроду прыведзеных звестак:

- акрамя таго, што сама яўка ў 85,70% выклікае абгрунтаваныя сумневы з нагоды недасяжнасці падобных значэнняў у аўтарытарных дзяржавах натуральным шляхам (не кажучы пра яўку, якая перавышае 90% у асобных рэгіёнах — пры гэтым сталіца дэманструе больш "рэальнае" значэнне ў 69,72%),

- ужо да 12 гадзін дня ў асноўны дзень галасавання выбары маглі быць прызнанымі адбытымі:[149] паводле афіцыйных даных, больш за палову грамадзян, уключаных у спісы, узялі ўдзел у галасаванні,

- даныя ЦВК дэманструюць мінімальнае стандартнае адхіленне яўкі паміж абласцямі: фактычна ўсюды актыўнасць выбаршчыкаў

[146] ЦВК, Сведения о ходе голосования в день выборов 11 октября 2015 г.: https://www.rec.gov.by/uploads/folderForLinks/elections-prb2015-gol.pdf

[147] *Аналітычная справаздача па выніках назірання за датэрміновым галасаваннем* (2020): https://elections2020.spring96.org/be/news/98886

[148] Радыё Свабода, *У Лоеве адна і тая ж жанчына трапіла на здымкі, зробленыя ля скрыняў для галасаваньня на розных выбарчых участках. ФОТА*, 26.01.2025: https://www.svaboda.org/a/33289412.html

[149] Арт. 79 Выбарчага кодэкса: лічыцца, што выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбыліся, калі ў галасаванні прыняло ўдзел больш за палову грамадзян Рэспублікі Беларусь, уключаных у спіс выбаршчыкаў.

ненатуральным чынам размяркоўваецца раўнамерна (уключаючы рэзкія скокі яўкі ў пэўныя інтэрвалы часу (у прыватнасці, 12.00-14.00) — сінхронныя паміж рознымі рэгіёнамі). У "жывым" працэсе падобныя лічбы павінны былі вар'іравацца мацней з прычыны мноства розных фактараў (дэмаграфічных, лагістычных, і гэтак далей).

Такім чынам, афіцыйныя даныя могуць паказваць на чарговыя маніпуляцыі з яўкай пры значным разыходжанні заяўленых лічбаў з рэальнасцю на выбарчых участках — што, як мы адзначалі раней, характэрна для аўтарытарных рэжымаў, што выкарыстоўваюць паказчык яўкі ў якасці доказаў легітіымізацыі дзеючай улады,[150] якая адбылася. У адсутнасць паўнавартаснага незалежнага назірання ацаніць дакладнасць прадстаўленых ЦВК лічбаў не ўяўляецца магчымым.

| | **Асноўны дзень галасавання 26.01, даныя яўкі (% ад зарэгістраваных выбаршчыкаў)** | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **10:00** | **12:00** | **14:00** | **16:00** | **18:00** | **20:00** |
| Агульная яўка | 47,55 | 56,63 | 66,41 | 75,48 | 81,5 | 85,70 |
| Брэсцкая вобласць | 51,09 | 61,34 | 72,87 | 80,88 | 86,42 | 90,56 |
| Віцебская вобласць | 45,85 | 54,38 | 65,11 | 74,29 | 80,92 | 86,39 |
| Гомельская вобласць | 51,16 | 62,84 | 72,92 | 80,91 | 86,68 | 91,54 |
| Гродзенская вобласць | 46,49 | 54,96 | 65,6 | 75,18 | 83,53 | 89,28 |
| Мінская вобласць | 45,9 | 54,27 | 63,73 | 76,5 | 83,12 | 86,71 |
| Магілёўская вобласць | 48,79 | 58,71 | 71,88 | 83,11 | 89,04 | 92,64 |
| г. Мінск | 44,37 | 51,28 | 56,60 | 62,47 | 66,83 | 69,72 |

### Умовы галасавання

Галасаванне ўжо традыцыйна[151] прайшло ў гранічна нагняталай абстаноўцы: паблізу участкаў знаходзіліся супрацоўнікі міліцыі, якія неслі службу ва ўзмоцненым рэжыме ў перыяд 20-27 студзеня[152] і гатовыя ўмяшацца ў любы момант для забеспячэння парадку. Супрацоўнікі МНС і

[150] *Выбары*2024. Папярэдняя аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года*, с. 22: https://elections2024.spring96.org/be/news/114566
[151] *Выбары*2024. Папярэдняя аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 года*, с. 22: https://elections2024.spring96.org/be/news/114566
[152] Вясна, *Падкантрольныя выбары*2025: асноўныя падзеі дня,* 26.01.2025: https://elections2025.spring96.org/be/news/117283
"Па словах начальніка галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Беларусі Аляксандра Купчэні, асабісты склад органаў унутраных спраў 20-27 студзеня нясе службу ва ўзмоцненым рэжыме".

медычныя брыгады таксама працавалі ва ўзмоцненым рэжыме.[153] Увага міліцыянтаў надавалася захаванню шэрагу абмежаванняў: забарона фатаграфаваць бюлетэні, выносіць іх за межы ўчасткаў, а таксама ўдзельнічаць у несанкцыянаваных мерапрыемствах. Нагадванні аб строгіх мерах бяспекі за апошнія гады, асабліва ў перыяд выбарчых кампаній, сталі часткай паўсядзённага жыцця. У той жа час, вядома пра, як мінімум, 10 заведзеных адміністрацыйных спраў за фатаграфаванне бюлетэняў[154] і пра факт вынасу каля 600 бюлетэняў.[155]

"Узмоцнены рэжым службы" з'яўляецца нічым іншым, як рэакцыяй уладаў на пратэсты 2020 года, якія пачаліся менавіта на ўчастках для галасавання, а таксама на праявы грамадзянскай актыўнасці на ўчастках падчас рэферэндуму 2022 года. Гэтыя меры не столькі накіраваныя на забеспячэнне парадку, колькі на папярэджанне і ўціск любой формы нязгоды. Пастаянны акцэнт на "бяспецы" замацоўвае ў грамадства адчуванне, што любое самастойнае дзеянне або выраз нязгоды можа расцэньвацца як небяспека і пацягне сур'ёзныя наступствы. Такая стратэгія кансервуе страх у грамадстве, абмяжоўваючы магчымасці грамадзян на актыўны ўдзел у выбарчых працэсах і свабоднае выказванне сваіх палітычных поглядаў.

Дзяржаўныя медыя ў дзень галасавання, нягледзячы на забарону агітацыі, апублікавалі матэрыялы, якія ўсхваляюць аднаго з кандыдатаў – Аляксандра Лукашэнку.[156] [157] Дэманстрацыя прамой падтрымкі А. Лукашэнкі ды ігнараванне забароны агітацыі ў дзень галасавання падкрэсліваюць ролю праўладных СМІ ў стварэнні бачнасці легітымнасці выбарчага працэсу, нягледзячы на яго парушэнні. Таксама ў дзень галасавання А. Лукашэнка ў афіцыйнай якасці дзеючага прэзідэнта правёў вялікую прэс-канферэнцыю, дзе прадставіў разгорнутую карціну сваіх дасягненняў, тым самым фактычна агітуючы за сябе і парушаючы забарону агітацыі ў асноўны дзень галасавання.[158]

Асаблівая роля праўладных СМІ заключаецца таксама і ў фармаванні карцінкі "атмасферы свята", якая нібыта адчуваецца на выбарчых

---

[153] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *В Беларуси обеспечен общественный порядок и безопасность на участках для голосования*, 26.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3288

[154] Наша Ніва, *За фота бюлетэняў у Мінску завялі 10 адміністрацыйных спраў*, 26.01.2025: https://nashaniva.com/360254

[155] ЦВК, Telegram @cikbelarus, 27.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3339

[156] Напрыклад: Агентство «Минск-Новости», *Беларусы в седьмой раз выбирают президента. Вспоминаем все избирательные кампании новейшей истории*, 26.01.2025: https://minsknews.by/belorusy-v-sedmoj-raz-vybirayut-prezidenta/

[157] Вясна, *Падкантрольныя выбары*2025: асноўныя падзеі дня,* 26.01.2025: https://elections2025.spring96.org/be/news/117283

"Гомельская праўда" праводзіць выставу дасягненняў Лукашэнкі: паказвае "жахі", якія пануюць у Беларусі да яго прыходу".

[158] Белта, *Президент Беларуси ответил на вопросы журналистов. Все темы в одном материале*, 26.01.2025:https://belta.by/president/view/lukashenko-provodit-press-konferentsiju-dlja-otechestvennyh-i-zarubezhnyh-smi-691447-2025/

участках.[159] Каб падмацаваць такое ўражанне, непрапарцыйную ўвагу лаяльныя да ўлады журналісты надаюць другарадным актыўнасцям на выбарчых участках, ігнаруючы рэальныя праблемы або недахопы працэсу.

Пры гэтым, незалежныя журналісты на выбарчых участках адсутнічалі і фактычна не мелі магчымасці весці альтэрнатыўныя рэпартажы. Патэнцыйнае з'яўленне незалежных журналістаў, гэтак жа як і назіральнікаў, стварыла б рызыку іх пераследу, як гэта адбылося з мноствам журналістаў, якія з'яўляюцца на сённяшні дзень палітвязнямі.[160]

На цяперашніх выбарах асабліва актыўна былі ўцягнутыя студэнты ў арганізацыю і падтрымку выбараў. Па даных ЦВК, 971 малады чалавек акрэдытаваны тэрытарыяльнымі і ўчастковымі камісіямі ў якасці нацыянальнага назіральніка; 3412 грамадзян да 31 года з'яўляюцца сябрамі ўчастковых камісій; электаральныя валанцёры ЦВК Беларусі суправаджаюць замежных (міжнародных) назіральнікаў. Студэнты МДЛУ выступаюць у якасці перакладчыкаў; каля 10 тысяч электаральных валанцёраў БРСМ аказваюць дапамогу маламабільным грамадзянам на ўчастках для галасавання; каля 1 тысячы інтэрв'юераў моладзевай лабараторыі БКМА праводзяць апытанне выбаршчыкаў па методыцы экзітпол.[161]

Студэнты, з'яўляючыся ўразлівай групай на выбарах праз сваю залежную пазіцыю ў адукацыйнай сістэме, з'яўляюцца найбольш успрымальнымі да маніпуляцый і ціску з боку ўладаў. Ва ўмовах рэпрэсіўнай атмасферы, калі назіральнікі і незалежныя журналісты сутыкаюцца з пагрозамі і пераследамі, масавы і найбольш верагодна прымусовы ўдзел студэнтаў у розных працэсах выбараў служыць інструментам легалізацыі таго, што адбываецца і дэманстрацыі бачнасці шырокай ўцягнутасці і празрыстасці, нягледзячы на абсалютна адсутны доступ незалежных структур.

Паводле звестак ЦВК, "114 грамадзян, якія пастаянна пражываюць за мяжой і стаяць на консульскім уліку, прыбылі ў Беларусь, каб узяць удзел у галасаванні".[162] Улічваючы, што на выбарах* 2024 г. навоўведзеным спосабам прагаласавала толькі 6 чалавек, лічба выглядае супярэчліва. Тым не менш, такая лічба і акцэнтаванне на ёй увагі з боку ЦВК закліканая прадэманстраваць дастаткова высокую зацікаўленасць на галасаванне

---

[159] "Витебские Вести" апублікавалі цэлы фотарэпартаж з участка, які знаходзіцца ў фізкультурна-аздараўленчым комплексе РУП "Віцебскэнерга". Абласная газета падкрэслівае "па-сапраўднаму святочную атмасферу, якую стварылі віцебскія энергетыкі" на ўчастку: https://vitvesti.by/obshestvo/na-izbiratelnom-uchastke-41-vitebskie-energetiki-sozdali-po-nastoiashchemu-prazdnichnuiu-atmosferu.html

[160] БАЖ, Рэпрэсіі супраць журналістаў і медыя ў 2025 годзе, спіс зняволеных: https://baj.media/be/aglyady-manitoringi/rjeprjesii-suprac-zhurnalista-i-medyja-2025-godze-spis-znjavolenyh/

[161] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Молодежь активно вовлечена в избирательный процесс. Подтверждаем*, 26.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3299

[162] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Интересные факты о дне выборов*, 26.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3329

ўнутры краіны, нягледзячы на абмежаванні, якія пазбаўляюць удзелу ў выбарах беларусаў, вымушаных пакінуць краіну праз пагрозу праследаў.

**Абвяшчэнне вынікаў галасавання**

Папярэдняя інфармацыя аб колькасці галасоў выбаршчыкаў, пададзеных за кожнага кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь апублікаваная ў тэлеграм-канале ЦВК.[163]

| **Кандыдат** | **% галасоў** |
|---|---|
| Гайдукевіч Алег Сяргеевіч | 2,02 |
| Канапацкая Ганна Анатолеўна | 1,86 |
| Лукашэнка Аляксандр Рыгоравіч | 86,82 |
| Сыранкоў Сяргей Аляксандравіч | 3,21 |
| Хіжняк Аляксандр Мікалаевіч | 1,74 |
| Супраць усіх | 3,60 |

На прэс-канферэнцыі ЦВК агучыла аналагічныя лічбы галасоў за кожнага з кандыдатаў, што пакідае на долю несапраўдных бюлетэняў 0,75%. Такія няроўназначныя даныя несапраўдных бюлетэняў пры правядзенні выбараў не электронным галасаваннем, а толькі папяровымі бюлетэнямі не адпавядаюць сусветнай практыцы. Паводле сусветнай базы даных па выбарах за апошнія 25 гадоў, сярэднім адсоткам несапраўдных бюлетэняў з'яўляецца каля 4,3%.[164]

Працэнт галасоў, аддадзеных за кандыдата А. Лукашэнку, на мінулых выбарах найбольшы з усіх, і па-ранейшаму з'яўляецца анамальнай колькасцю галасоў за аднаго і таго ж кандыдата.

| **Год выбараў прэзідэнта** | **% нібыта набраных галасоў кандыдатам А. Лукашэнкам** |
|---|---|
| 2025 | 86,82 |
| 2020 | 80,10 |
| 2015 | 83,47 |
| 2010 | 79,65 |

[163] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Предварительная информация о количестве голосов избирателей, поданных за каждого кандидата в Президенты Республики Беларусь*, 27.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3330

[164] ACE: The Electoral Knowledge Network. What is a “normal threshold” of invalid votes? https://aceproject.org/today/forum/spotlight-on/what-is-a-201cnormal-threshold201d-of-invalid

| | |
|---|---|
| 2006 | 83,00 |
| 2001 | 79,65 |
| 1994 | 80,1 |

3 лютага ЦВК правядзе пасяджэнне па ўстанаўленні вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на падставе пратаколаў тэрытарыяльных камісій па выбарах Прэзідэнта.

## 9. СКАРГІ ДЫ ЗВАРОТЫ

ЦВК паведаміў пра паступленне 2 200 вусных і больш за 100 пісьмовых зваротаў,[165] большасць з якіх датычацца тэхнічных пытанняў — удакладнення інфармацыі аб месцах збору подпісаў, сустрэчах кандыдатаў і ўчастках для галасавання. ЦВК заяўляе, што дадзеныя звароты, факт якіх немагчыма праверыць, сведчыць аб высокай цікавасці грамадзян да выбараў.

Пры гэтым, адсутнічалі хоць якія-небудзь скаргі на ўсіх этапах выбарчай кампаніі.[166] Адсутнасць скаргаў на парушэнні ў выбарчай кампаніі з'яўляецца трывожным сігналам. Ва ўмовах сумленнага, свабоднага і дэмакратычнага выбарчага працэсу скаргі з'яўляюцца індыкатарам актыўнасці і зацікаўленасці грамадзян у захаванні іх правоў і свабод у працэсе выбараў. Аднак ва ўмовах рэпрэсій і страху перад пераследамі грамадзяне аддаюць перавагу маўчаць, калі сутыкаюцца з парушэннямі. Гэтая адсутнасць скаргаў хутчэй пацвярджае ўціск грамадскай думкі і грамадзянскай актыўнасці, чым сведчыць пра бездакорнасць ходу выбарчай кампаніі.

Такім чынам, заява ЦВК аб высокай цікавасці да выбараў, заснаванай на лічбах атрыманых вусных і пісьмовых зваротаў, не адлюстроўвае рэальную сітуацыю ды ігнаруе фактычны ўціск свабоднага палітычнага ўдзелу. Больш за тое, толькі звароты арганізацыйнага характару не могуць быць эквівалентныя цікавасці выбаршчыкаў да выбараў, бо яны не датычацца свабоднага выбару, парушэнняў правоў кандыдатаў і выбаршчыкаў. Наадварот, адсутнасць скаргаў сведчыць, што грамадзяне

[165] СТВ, Youtube, *Итоговая пресс-конференция ЦИК Беларуси «О предварительных итогах выборов Президента Республики Беларусь» в Информационном центре ЦИК Беларуси*, 27.01.2025: https://www.youtube.com/watch?v=oJa_C2eQTo4

[166] ЦВК, Telegram @cikbelarus, *Жалобы о нарушении кандидатами и их доверенными лицами законодательства в период агитации в ЦИК не поступали*, 25.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3258, 10.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3095;

*В ЦИК Беларуси не поступало жалоб ни от кандидатов в Президенты, ни от граждан*, 23.01.2025: https://t.me/cikbelarus/3190;

*На этапе сбора подписей официальных жалоб, претензий не было,* 06.12.2024: https://t.me/cikbelarus/2981;

*Ад грамадзян або назіральнікаў не паступалі скаргі аб парушэннях патрабаванняў выбарчага заканадаўства ў працэсе галасавання або пры падліку галасоў, якія маглі б паўплываць на выніку выбараў,* 27.01.2025*:* https://t.me/cikbelarus/3340

баяцца актыўна ўдзельнічаць у выбарчым працэсе, што пацвярджае рэпрэсіўны характар кампаніі.